PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl

№ 48 (2429) Год XLVII | Беласток, 1 снежня 2002 г. | Цана 2,00 зл.

Беларусь і Украіну пасылаюць у Расію

Яўген Мірановіч

Усё паказвае на тое, што спробы прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі адмяніць інтэграцыйны працэс з Расіяй закончыліся паражэннем. Аказваецца, не толькі эканамічная і палітычная залежнасць Беларусі ад усходняй суседкі прымушае ўлады краіны трымацца крамлёўскай кляміі, але таксама ўся палітычная кан'юнктура ў Еўропе.

Пасля славутых прапаноў прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна наконт уключэння Беларусі ў склад Федэрацыі, Лукашэнка пачаў шукаць шырэйшых кантактаў з заходнееўрапейскімі краінамі з нескрыванай мэтай — пашырыць поле незалежнасці ад крамлёўскага цэнтра. Намерыўся ён нават паехаць у Прагу і прыняць удзел у Саміце НАТА. Аднак чэшскія ўлады адмовіліся выдаць яму ўязную візу. Гэта крайняя форма прыніжэння кіраўніка дзяржавы. Усё адбылося пад лозунгам занепакоенасці парушэннем дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі. Зразумела, што чэхі не зрабілі гэтага без ранейшага паразумення з амерыканцамі і еўрапейскімі саюзнікамі. Зараз пасля чэшскай дэманстрацыі ў абарону дэмакратыі ў Беларусі адазваліся дыпламаты Еўрасаюза, якія таксама аб'явілі пра свае планы ізаляцыі беларускіх улад. Усё гэтае было б лагічным і апраўданым, калі б такія рашэнні прымаліся пасля рэферэндумаў 1995 і 1996 гадоў, арыштаў дэманстрантаў вясной 1996 г., парламенцкіх выбараў 2000 г. ці прэзідэнцкіх выбараў 2001 г. Цяпер, аднак, калі Лукашэнка, хай сабе і па асабістых прычынах, змагаецца за самае існаванне дзяржавы, прымаюцца супраць яго рашэнні, якія фактычна з'яўляюцца ізаляцыяй Беларусі. Уладам краіны, такім чынам, вызначаецца толькі адзін вектар палітыкі, які вядзе да яшчэ большай залежнасці ад Расіі.

Усё паказвае, што лёс Беларусі таксама раздзеліць Украіна. Хаця амерыканцы забаранілі запрашаць прэзідэнта Леаніда Кучму ў Прагу, аднак чэшскія ўлады не адважыліся патрактаваць яго як Лукашэнку. Ніхто таксама, пакуль што, не збіраецца ізаляваць украінскае кіраўніцтва, хаця Кучму даказалі дачыненне да забойства нявыгаднага яму журналіста, а і дэмакратыі ў Кіеве нічуць не больш чым у Мінску. Выразна відаць аднак змену тону выказванняў НАТАўскіх палітыкаў і прапагандыстаў у справе Украіны. Усё гэта паказвае, што амерыканцы вызначылі гэтай краіне месца ў расійскай зоне ўплываў. Праўдападобна ўзамен атрымалі згоду Пуціна на свабоднае вырашэнне справы Ірака і ўсяго Блізкага Усходу.

[працяг ☞ 2]

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вольга Сянкевіч і гайнаўскія белліцэісты

З новай праграмай і падручнікамі

Аляксей Мароз

Нядаўна выйшлі з друку падручнікі па беларускай мове ў гімназіі і ліцэі. Сярод іх — падручнік па літаратурнай і культурнай адукацыі „Са словам праз стагоддзі" для вучняў I класа сярэдніх школ аўтарства Вольгі Сянкевіч — настаўніцы Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. Падрыхтавала яна праграмы для навучання беларускай мовы ў I-III класах гімназіі і сярэдняй школы, патрабаванні для экзаменаў на атэстат сталасці па беларускай мове і з'яўляецца сааўтарам хрэстаматыі для сярэдніх школ па беларускай літаратуры.

Праграма навучання па беларускай мове і літаратуры для сярэдніх школ атрымала станоўчыя рэцэнзіі навуковых супрацоўнікаў Кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта д-р Ядвігі Глушкоўскай-Бабіцкай і д-р Тэрэсы Ясінскай-Сохі і ў кастрычніку гэтага года была зацверджана Міністэрствам нацыянальнай адукацыі. Раней настаўнікі белліцэяў вучылі беларускай мове на падставе сваіх аўтарскіх праграм, маючы на ўвазе супольна прынятыя матуральныя патрабаванні. Праграма для гімназіі чакае рэцэнзій.

Наватарства праграмы Вольгі Сянкевіч праяўляецца ў спосабах навучання і падборцы матэрыялаў для адукацыйнага працэсу. Аўтарка адыходзіць ад засвойвання энцыклапедычных ведаў і многа ўвагі адводзіць развіванню ўмеласцей вучняў. Згодна з патрабаваннямі падрыхтаванымі для экзамену на атэстат сталасці па беларускай мове, у праграме прадбачаны падставовы і пашыраны курсы навучання.

— Старалася я адысці ад падрабязнага пераказу зместу твораў, адводзячы больш месца на іх інтэрпрэтацыю і аналіз. Будзем старацца параўноўваць беларускую прозу і паэзію да сусветнай літаратуры, гісторыі і культуры, якія развіваліся ў паасобных перыядах. Карыстаючыся навейшымі апрацоўкамі зрабіла я падзел на эпохі, вылучаючы самыя сучасныя перыяды ў літаратуры, культуры і грамадскім жыцці, — заявіла Вольга Сянкевіч. — Звярнула я ўвагу на паўстанне 1863-1864 гг. на нашых землях, узнікненне Беларускай Народнай Рэспублікі, трагедыю ў Курапатах і асобу Браніслава Тарашкевіча.

Аўтарка ўвяла элементы гісторыі, культуры і традыцыі Беласточчыны, звяртаючы ўвагу на старыя гарады: Супрасль, Бельск і Драгічын. У праграме многа месца адводзіцца Вялікаму княству Літоўскаму, прыводзіцца творчасць Гарэцкага, Зарэцкага, Арсенневай, Сяднёва, Караткевіча, Быкава, Разанава, Дударава і іншых аўтараў, якую раней з-за недахопу матэрыялаў настаўнікі мала разглядалі. Настаўнікі будуць гаварыць аб жыцці нацыянальных меншасцей у пасляваеннай Польшчы і іх самаўрадавай дзейнасці пасля 1989 года.

— Падбіраючы літаратуру старалася я вывесці правінцыяльныя сялянскія тэмы і паказаць беларусаў як народ, які патрапіць задбаць пра сябе. Увяла я экзістэнцыяльныя і філасофскія тэмы, якія закранаюцца ў творчасці Максіма Багдановіча і іншых пісьменнікаў і звярнула ўвагу на горад. Сялянскую тэму пакінула я пры нагодзе разгляду „Новай зямлі" Якуба Коласа. Падбіраючы ма-

[працяг ☞ 2]

Хочам увесці нармальнасць ☞ 3

Стараста Славамір Ежы Снарскі сказаў, што будзе служыць усім жыхарам Бельскага павета незалежна ад іх нацыянальнасці і старацца ліквідаваць усялякія падзелы. Старшыня рады Уладыслаў Ягела паінфармаваў, што будзе намагацца адкрыць у Бельску вышэйшую навучальную ўстанову і стварыць саюз самаўрадаў Бельскага павета.

Наша Крынічнае ☞ 4

На ганку, дзе іграліі цвыркуны, дзяўчаты ўміг падрыхтавалі застолле (Янка Брыль быў у клопаце, жонка пайшла ў лес па брусніцы). Мы праспявалі юбіляру „Многая лета", а сам Янка Брыль узнёс слаўны ўкраінскі тост: „Хай будэ грэчка"!

Сапраўдны сцяг ☞ 4

Пабачыўшы ў сшытку сястры гістарычны сцяг, сцвердзіла я, што, мабыць, выхоўваюць мне Олю на патрыётку. Мо, падумала я гэта ў кепскую хвіліну, бо неўзабаве сястра прыбегла задаволена і спытала: „А ведаеш, як выглядае сапраўдны сцяг Беларусі?" „Ведаю, бел-чырвона-белы..." — „А не!" Гэта сцяг беларусаў у Польшчы, а сапраўдны сцяг сапраўдных беларусаў у Беларусі — зялёна-чырвона-белы!"

Юбілейны канцэрт „Каласкоў" ☞ 8

„Каласкі паўсталі ў 1972 годзе на базе старога калектыву, і, хаця яго склад часта змяняўся, гурт існуе і дабіваецца поспехаў. На ўвагу заслугоўвае асоба артыстычнага кіраўніка і інструктара — Алы Каменскай, вядомай прыхільнікам яе таленту як „падляшскі салавей".

Жывем бядуючы ☞ 9

Бернікі тры разы ў мінулым стагоддзі гарэлі. Перыяд абезлюдзеласці ў час бежанства будынкі вытрымалі; няшчасці з'явіліся пазней. 2 жніўня 1939 года адна жанчына зацярушыла агонь. Калі праваслаўныя жыхары вёскі вярнуліся з Ячна са свята Ільі, у вёсцы ўжо былі папялішчы.

Чалавек мінулай эпохі ☞ 11

Сустрэчы з людзьмі, якіх амаль цэлае жыццё прайшло ў мінулым стагоддзі, надта павучальныя, дазваляюць зразумець нядаўняе мінулае. Я мела магчымасць спаткаць такога чалавека. Гэта выдатны кампазітар, класік беларускай савецкай музыкі, які ў 1938 г. заснаваў Саюз кампазітараў Беларусі — Анатоль Васільевіч Багатыроў.

Беларусь — беларусы

Як галасавалі на Беларускі выбарчы камітэт у самаўрадавых выбарах 27 кастрычніка 2002 г.	
Гарадская рада Беластока	
1 акруга (Śródmieście, Liniarskiego, Przydworcowe, Kopernika, Tysiąclecia, Skłodowskiej, Piaski, Waryńskiego, Bema)	**514**
Алег Латышонак	283
2 акруга (Sienkiewicza, Białostoczek, Pietrasze, Wysockiego-Zgoda, Jaroszówka, Wyżyny, Bagnówka, Pieczurki, Wygoda, Traugutta)	**600**
Юры Хмялеўскі	229
3 акруга (Bojary, Kraszewskiego, Chopina, Piasta I, Piasta II, Skorupy, Nowe, Dojlidy, Przemysłowe, Mickiewicza)	**792**
Антон Мірановіч	575
4 акруга (Nowe Miasto, Ścianka, Bażantarnia, Starosielce, Zielone Wzgórza, Słoneczny Stok, Leśna Dolina, Marczuk, Młodych)	**982**
Уладзіслаў Петрук	293
Пётр Хомік	238
5 акруга (Tuwima, Przyjaźń, Sady Antoniukowskie, Dziesięciny I, Fasty, Bacieczki, Wysoki Stoczek, Bacieczki II, Dziesięciny II, sołectwo Zawady)	**610**
Маргарыта Борыс	252
Агулам у Раду Беластока	**3 498**
Сеймік Падляшскага ваяводства	
1 аркуга (miasto Białystok)	**2 472**
Сакрат Яновіч	1 736
4 акруга (powiaty: zambrowski, wysokomazowiecki, siemiatycki, bielski)	**5 570**
Ян Чыквін	4 846
5 акруга (powiaty: moniecki, sokólski, hajnowski, białostocki)	**7 502**
Яўген Вапа	5 134
Агулам у Сеймік ваяводства	**15 544**
Прэзідэнт Беластока	
Антон Мірановіч	**4 956**

З новай праграмай і падручнікамі

[1 ☞ працяг]

тэрыял для праграмы старалася я дапасаваць яго да эмацыянальных патрабаванняў вучняў, — паінфармавала Вольга Сянкевіч.

Каля трэцяй часткі вучняў у белліцэі не вучылася раней беларускай мове і для іх падрыхтаваны ў праграме спецыяльны матэрыял, які першакласнікамі будзе рэалізавацца ў верасні і кастрычніку.

Настаўнікі працуючы з вучнямі, якія раней не вучыліся беларускай мове, будуць звяртаць увагу на чытанне тэкстаў з іх зразуменнем і многа размаўляць з моладдзю. Курс граматыкі абмежаваны да паўтарэння асноўных ведаў з падставовай школы і гімназіі і развівання ўмеласцей з выкарыстаннем літаратурных тэкстаў. У першым класе многа месца адводзіцца арфаграфіі.

У кастрычніку гэтага года за наватарства ў рэфармаванні беларускага школьніцтва Вольга Сянкевіч была ўзнагароджана Медалём Камісіі нацыянальнай адукацыі.

Аляксей Мароз

Смуткуем з Табой, Мацей,
з прычыны напаткаўшага цябе гора — смерці мамы Галіны
з Брысевічаў Халадоўскай. Сябры з „Нівы".

Лістападаўская драма

Не паспелі крыху прыціхнуць жарсці вакол скандалу з аплатай беларускім урадам расійскага газу, як надышоў час новага крызісу ў знешніх адносінах лукашэнкаўскай адміністрацыі.

Шчыра кажучы, гэты самы крызіс выспяваў ужо даволі доўгі час. Карані яго варта шукаць у 1996 годзе, калі ў выніку сумнавядомага рэферэндуму выканаўчая ўлада на чале з прэзідэнтам Лукашэнкам фактычна вызваліла сябе ад якой-небудзь сур'ёзнай процівагі з боку парламента і Канстытуцыйнага суда. Тады вынікі яго не былі прызнаны Захадам, а працяг прэзідэнцкіх паўнамоцтваў на два гады быў азначаны як нелігітымны.

Наступны выбух непрыязнасці адбыўся на наступны год. І быў звязаны з незаконным высяленнем амбасадараў шмат якіх заходніх краін з іхніх рэзідэнцый у пасёлку Дразды пад Мінскам. Многія ўжо тады палічылі, што адносіны з Захадам у Беларусі падарваныя на вельмі працяглы час. Але, як аказалася, будучыня прыхавала яшчэ не адзін „цікавы" момант у беларуска-еўрапейскіх дачыненнях. Дакладней, дачыненнях А. Лукашэнкі і яго атачэння з кіраўніцтвам большасці еўрапейскіх дзяржаў. Пра ўсіх іх казаць няварта, дастаткова толькі ўзгадаць непрызнанне беларускага лідэра як дэмакратычна абранага пачынаючы з 1999 года, непрызнанне за адпаведныя нормам не толькі дэмакратыі, але і ўласна беларускага выбарчага заканадаўства выбараў у Палату прадстаўнікоў у 2000 годзе, ну і, нарэшце, аналагічнае непрызнанне вынікаў прэзідэнцкіх выбараў летась.

У той час як стасункі паміж Беларуссю і заходнімі краінамі, а таксама міжнароднымі арганізацыямі кшталту Рады Еўропы, АБСЕ, Еўрасаюза ўскладняліся, яе саюзніца Расія імкнулася па знешнепалітычных і знешнеэканамічных напрамках заваяваць найбольшы аўтарытэт. Таму і стаўшы рэальнасцю ўваход шэрагу былых сяброў Варшаўскай дамовы ў НАТА не ўспрымаўся апошняй надта хваравіта. Наадварот, Расія стала, як кажуць, набіраць ачкі, заявіўшы аб шчыльным супрацоўніцтве з гэтым ваенна-палітычным блокам. У выніку, Беларусь пад уладай А. Лукашэнкі засталася адзінай на кантыненце з успрыманнем новых міжнародных рэалій з пазіцый часоў процістаяння ідэалогій. Хаця, папраўдзе кажучы, нейкай зразумелай ідэалогіі, акрамя прапаганды неабходнасці мацавання асабістай улады сённяшняга беларускага лідэра, ва ўнутранай палітыцы кіраўніцтва дзяржавы заўважыць цяжка. Тым не менш, антызаходняя і антыамерыканская істэрыя там перажывае рэнесанс.

Пражскі саміт Рады Еўраатлантычнага партнёрства, у якое Беларусь увайшла на пачатку 90-х гадоў, для цяперашняга беларускага прэзідэнта стаў свайго роду адказам не толькі на дзёрзкія, надта эмацыйныя выказванні ў бок НАТА, ЗША, Еўропы, але і на паводзіны з місіяй АБСЕ у Мінску, сябры якой з-за непрацягнення віз пазбавіліся магчымасці выконваць свае функцыі. Кіраўніцтва НАТА і ЗША адразу выказаліся супраць прыезду на саміт А. Лукашэнкі, зважаючы на згаданыя раней чыннікі, а таксама пагаршэнне сітуацыі з палітычнымі свабодамі і правамі чалавека ў Беларусі.

Так адбылося, што ўвесь гнеў беларускага кіраўніка пачаў вылівацца на Чэхію яшчэ да таго, як тая канчаткова вырашыла не даваць яму аднаму з усёй беларускай дэлегацыі ўязной візы. Пагрозы далі свой вынік — цяпер еўрапейскія прэзідэнты не лічаць свайго беларускага калегу роўным сабе і не жадаюць сядзець з ім нават у адной зале. А 14 краін Еўрасаюза ўвогуле забаранілі уезд на сваю тэрыторыю васьмярым вышэйшым беларускім чыноўнікам. Прычыны ўсё тыя ж.

Як казаў класік — калі зоркі ў небе ўспыхваюць, значыць гэта камусьці патрэбна. Беручы пад увагу хваравітую рэакцыю А. Лукашэнкі на такі паварот справы, яму наўрад ці прыемна адчуваць сябе ізгоем. Еўропе, як кажуць, ні цёпла, ні халодна, бо такім рашэннем яна падводзіць рысу пад беспаспяховымі спробамі паўплываць на беларускае кіраўніцтва дыпламатычнымі намаганнямі і, што называецца, „умыла рукі". Цікавай аказалася рэакцыя Расіі на фактычную знявагу бліжэйшага саюзніка. Расійскі міністр замежных спраў С. Іваноў стрымана назваў дзеянні чэхаў „перажыткам халоднай вайны". Гэткі напаўспачувальны прысмак, які нічога не значыць і ні да чаго не абавязвае.

Таму падаецца, што выйграла ад лістападаўскай драмы беларускага прэзідэнта менавіта крамлёўскае кіраўніцтва, для якога ўсё менш прычын размаўляць з ім як з лідэрам хоць і братняй, але усё ж іншай дзяржавы, і ўсё больш падстаў бачыць у асобе Аляксандра Лукашэнкі васальнага кіраўніка падуладнай тэрыторыі.

Уладзімір Лапцэвіч

Беларусь і Украіну пасылаюць у Расію

[1 ☞ працяг]

Хаця амаль на цэлай постсавецкай прасторы няма ні дэмакратыі, ні свабоды слова, пад цэнзурай апынулася толькі Беларусь, а апошнім часам таксама Украіна. Расія тым часам са сваёй мафійнай палітычнай сістэмай стала „стратэгічным партнёрам дэмакратычнага свету". Дарэчы, заўсёды, калі Захад мае ў планах парушэнне існуючага парадку, пачынае бараніць правы чалавека. Пару гадоў таму абаранялі правы албанцаў у Косаве коштам парушэння суверэнітэту і інтэгральнасці Сербіі. Сербія, як цяпер Беларусь, была краінай без рэальных саюзнікаў. Таму можна было зраўняць з зямлёю палову яе тэрыторыі, што пайшла ў карысць албанскай мафіі, якая пераняла поўную ўладу ў гэтай сербскай правінцыі, выгнаўшы раней амаль усіх сербаў.

Забарона ўезду ў краіны Еўрасаюза высокім чыноўнікам Беларусі абазначае, што дэмакратыі будуць яны вучыцца ў Маскве. Лукашэнка і яго акружэнне гэта ў сапраўднасці прадукт савецка-расійскай палітычнай школы. Таму ў Маскве могуць яны толькі дасканаліць сваю адукацыю. Апазіцыя ў Беларусі патрабавала маральнай і палітычнай падтрымкі ў палове дзевяностых гадоў, калі яна яшчэ існавала. Але тады можна было прачытаць у „дэмакратычных" газетах як беларусы падчас рэферэндуму выказаліся за рускую мову і савецкія сімвалы. Апазіцыі не хацеў тады слухаць ніводзін натаўскі палітык. Сёння нават невядома, што больш небяспечнае для суверэнітэту Беларусі — непрадказальны Лукашэнка, ці апазіцыйныя дзеячы, якія дэмакратыі пастаянна вучыліся ў Маскве, экзамены ездзілі здаваць у Брусель, Лондан ці Нью-Йорк, а за дасканалую навуку ад усіх бралі стыпендыі.

Незалежніцкі і нацыянальны лагер, які ўвасабляў Зянон Пазьняк, фактычна рассыпаўся. Хаця ёсць даволі вялікая група патрыётаў, але няма ў яе лідэра, які аб'яднаў бы гэты рух, надаў яму сэнс і ідэю. Не мае гэтая арыентацыя таксама даверу з боку г.зв. „дэмакратычнага свету". Таму на гэты момант найбольш карысным для Беларусі было б, калі б Лукашэнка адназначна накіраваўся на шлях пабудовы суверэнітэту краіны. Рэакцыя Захаду вызначае яму адваротны напрамак. Дэмакратыі ў Беларусі няма і доўга яшчэ яе не будзе, хіба што імітацыя яе на падабенства расійскай ці ўкраінскай. У гэтай частцы свету не вырасла яшчэ ніводнае пакаленне, якое мела б дачыненне да дэмакратыі. У выпадку Беларусі спачатку павінен быць свой дом, а толькі пасля можна ў ім рабіць парадак, нават і дэмакратычны.

Яўген Мірановіч

Вачыма паляка

Помста ідзе?

Найсалодшая помста. Кожны з нас такі сказ мог пачуць у фільмах, і то не толькі ў меладрамах. А паколькі кіно, кажуць, люстэрка жыцця (вядома, не заўсёды прама, напрыклад, у прадукцыях *science fictions*), то мы ўжо прывыклі, што трэба зважаць на помслівых ды іх асцерагацца.

Мой блізкі знаёмы, запутаны ў палітычнае жыццё Беластока, асцерагаў мяне ў апошні час, а за мною хацеў асцерагчы ўсіх беларусаў перад вынікамі самаўрадавых выбараў, якія стануць эфектам самастойнага старту Беларускага выбарчага камітэта і быццам маючым з гэтым сувязь бракам большасці Саюза левых дэмакратаў у беластоцкай Гарадской радзе, падляшскім сейміку ды пройгрышам у другім туры выбараў праф. Збігнева Пухальскага.

— Бо ж ведаеш ты... — казаў знаёмы, — калі б не ўзнік БВК, а ўсе беларусы пайшлі разам з СЛД, былі б шанцы на левую большасць... А да таго яшчэ Антон Мірановіч пасля пройгрышу падтрымаў правага Тура. Не ўспомню ўжо пра падтрымку БВК Новака-Езяранскага. СЛД краінай яшчэ кіруе. Цэнтр Саюза зробіць вывады з пройгрышу. Ад іх усё яшчэ залежыць, ці паасобныя меншасныя арганізацыі і часопісы атрымаюць датацыі. І ў Беластоку, і ў рэгіёне будуць шукаць казла адпушчэння. І будзе ім БВК і людзі, якія за ім стаяць, значыць, для прыкладу, твая „Ніва".

Не ведаю, ці гэтак будзе. Ведаю, аднак, што СЛД любіць прымяняць прынцып „хто не з намі, той супраць нас" (дарэчы, не толькі СЛД яго любіць). Беручы пад увагу галасы на апошнім з'ездзе БГКТ (саюзнай арганізацыі з левымі дэмакратамі), якія дамагаліся забраць „Ніву" пад крылы Таварыства, праўдападобнасць помсты на тыднёвіку — досыць верагодная. Урэшце ж частка асоб тут пішучых і з рэдакцыяй звязаных узяла на сябе адказнасць звязаную з заснаваннем БВК і самастойнасцю. Што СЛД можа зрабіць? — абрэзаць датацыю з будучага года свайго міністэрства культуры, больш адмыслова абмяжоўваючы ўжо абмежаваную да такога ўзроўню, каб від успамагання быў, але гэтае рашэнне давяло да заняпаду і ў выніку да натуральнай смерці „Нівы" так, каб пазней магла яна адрадзіцца пад адзінаслушнымі крыламі.

Не хачу быць ліхім прарокам, але ўсё паказвае на тое, што можа гэтак стацца, што можа мець рацыю мой знаёмы. Але ці так мусіць быць? Калі так будзе, дык усё беларускае асяроддзе можа быць ужо цалкам упэўненым, што служыць яно СЛД выключна безадкладным (у галоўным — выбарным) мэтам. Што яно выкарыстоўваецца па прынцыпу кія і морквы. У выніку ды існасці паддаецца яно пастаяннаму шантажу. Разлічваю, аднак, на тое, што нізкія эмоцыі не возьмуць верху над інтарэсам, звязаным з г.зв. ушанаваннем правоў меншасцей на свабоду і дэмакратычныя правы і „Ніву" не толькі не „скасуюць" у акце салодкай помсты, але будуць ёй вернуты, у сувязі, як кажуць, з лепшай эканамічна-гаспадарчай сітуацыяй, датацыі з часу перад крызісам фінансаў дзяржавы. Урэшце ж, як казаў Лешак Мілер, мужчыну пазнаюць па тым, як канчае, значыць, як разумею, і па тым, як прайгрывае (вядома, як і выйгрывае).

Мацей Халадоўскі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Радныя „Бельскай кааліцыі" . У першым радзе злева: Міраслаў Бало, Васіль Ляшчынскі, Галена Бушко, Пётр Божка і Сяргей Лукашук

Хочам увесці нармальнасць

На першую сесію Рады Бельскага павета, якая адбылася 16 лістапада ў вялікай зале Дома настаўніка ў Бельску прыйшло многа людзей. Яшчэ да пасяджэння заняты былі ўсе месцы. Людзі стаялі ў зале і калідоры. Зацікаўленне бяльшчан выклікала вестка аб супрацоўніцтве „Бельскай кааліцыяй" з правымі і левымі раднымі.

Спачатку радныя прынеслі прысягу, а пасля пачаліся выбары старшыні Рады. Хаця за гэтую пасаду змагаліся толькі двух кандыдатаў, то лічэнне галасоў зацягнулася і выклікала шмат эмоцый. Перамог Уладыслаў Ягела з камітэта „Наша Падляшша", за якога прагаласавала 12 радных. Аляксандра Галамбецкага з Самаўрадавай правіцы „Еднасць" падтрымалі толькі 5 радных. Пазней выбары павятовых улад праходзілі хутка. Радныя „Бельскай кааліцыі", камітэтаў „Наша Падляшша" і СЛД-УП завязалі кааліцыю і яе прадстаўнікі былі абраны на найважнейшыя павятовыя пасады. Намеснікамі старшыні Рады сталі дырэктар ПШ № 3 Васіль Ляшчынскі з „Бельскай кааліцыі" і Юрый Іванчук з СЛД-УП. Старастам стаў Славамір Ежы Снарскі з „Нашага Падляшша", а яго намеснікам — Пётр Божка з „Бельскай кааліцыі". Павятовую ўправу састаўляць стараста, яго намеснік і двух членаў: Галіна Бушко з „Бельскай кааліцыі" і Збігнеў Шпакоўскі з „Нашага Падляшша". Сакратаром стаў Рышард Анусевіч, а скарбнікам — Бажэна Звалінская, якія не з'яўляюцца раднымі. Апазіцыю ў 19-асабовай радзе складаюць 6 радных Самаўрадавай правіцы „Еднасць".

— Папярэдняя павятовая ўлада была вельмі недаступная і думала толькі пра сябе. Зараз завязалася кааліцыя, якая будзе прадстаўніком розных палітычных сіл і нацыянальнасцей. Хочам у Бельскім павеце ўвесці нармальнасць, каб не было падзелу на сваіх і чужых. Ёсць шанс на супрацоўніцтва дзеля дабра ўсіх жыхароў, — заявіў Васіль Ляшчынскі, якога ў мінулай кадэнцыі нават не дапусцілі да працы ў камісіях. — Радныя „Бельскай кааліцыі" будуць мець уплыў на пастановы і змогуць рэалізаваць уласную выбарчую праграму.

Стараста Славамір Ежы Снарскі сказаў, што будзе служыць усім жыхарам Бельскага павета незалежна ад іх нацыянальнасці і старацца ліквідаваць усялякія падзелы. Старшыня рады Уладыслаў Ягела паінфармаваў, што будзе намагацца адкрыць у Бельску вышэйшую навучальную ўстанову і стварыць саюз самаўрадаў Бельскага павета.

Аляксей Мароз

Нашы гміны ў сеціве

У апошні час многа гаворыцца пра гміны, войтаў і радных. Гэта падштурхнула мяне да таго, каб паглядзець як прадстаўлены гміны і гарады ў Інтэрнэце. Ці вэб-старонкі гэтых устаноў зроблены прафесійна.

Сваю экскурсію пачаў я з гміны Бельск-Падляшскі (http://www.bielskpodlaski.pl). Старонка гэтая трохмоўная: польская, англійская і ўкраінская. Адразу кідаецца ў вочы, што няма беларускамоўнай версіі, а беларусаў у гэтай гміне вельмі многа! Адначасова сайт на ўкраінскай мове не хоча адчыняцца. Я вымушаны быў увайсці на польскамоўную версію. З вэб-старонкі можна даведацца пра гміну амаль усё: турызм, гісторыя, прапанова інвестарам, аб'явы, прозвішчы кіраўнікоў гміны і г.д. Цікавы раздзел „Турызм". Прадстаўлены ў ім „Шлях праваслаўных цэркваў". Можам пабачыць яго на карце і на здымках. Шлях пачынаецца ад ракі Нарвы і вядзе праз Плёскі, Кнаразы, Храбалы, Райск, Гацькі, Грыневічы, Бельск-Падляшскі ў Парцава. Дакладна апісаны маршрут і помнікі, якія можна наведаць. Апрача таго можам даведацца пра аўкцыёны, якія адбываюцца ў гміне, можам перапісаць і аддрукаваць патрэбныя нам дакументы.

Чарговым этапам маёй экскурсіі стала гміна Орля (http://orla.pl/). Гэтая старонка зроблена больш прафесійна чым папярэдняя. Яна вельмі каляровая, празрыстая — аж хочацца заглянуць усярэдзіну. Спачатку націснуў я на „Фотагалерэю". На ёй паказана шмат здымкаў самых важных будынкаў у гміне. Цікавым для мяне паказалася тое, што ў Орлі вельмі прыгожы герб. На старонцы можам даведацца пра састаў гмінных улад, даюцца тэлефоны і кароткае апісанне ўсіх устаноў у гміне. Можам таксама паслаць электронны ліст войту. На сайце пералічаны ўсе інвестыцыі ў гміне. Кароткі прадстаўлены фірмы, якія дзейнічаюць на тэрыторыі гміны. Даволі многа месца адведзена гісторыі рэгіёна. Аднак і такая добрая старонка мае недастатак — адсутнасць версіі на іншых мовах.

Рафал Галушэўскі

Першая сесія

15 лістапада г.г. у Чаромсе адбылася інаўгурацыйная сесія Рады гміны. Старшыня Гміннай выбарчай камісіі Галена Зазонюк уручыла пасведчанні аб выбары войту Міхалу Врублеўскаму і радным, якія далі прысягу.

У час выбару старшыні Рады гміны прад'яўлены былі тры кандыдатуры: Яна Купрыцюка, Ежы Анушкевіча і Евы Палькоўскай. У выніку галасавання перамог Ян Купрыцюк. Намеснікам старшыні Рады была выбрана Ева Палькоўская. Нававыбраны старшыня падзякаваў выбаршчыкам і дэпутатам за давер і выказаў спадзяванне „на супрацоўніцтва ўсіх радных, бо яны абяцалі грамадству ў час выбараў добрасумленную працу на карысць нашай гміны". Ян Купрыцюк адзначыў, што большасць радных гэта новыя людзі з вялікай ахвотай да працы ў карысць гміны, са шматлікімі карыснымі прапановамі, якія могуць быць рэалізаваны пры адпаведным супрацоўніцтве з войтам. Войт, на думку старшыні рады, можа лічыць на падтрымку, калі яго рашэнні будуць разважлівымі і служыць усяму грамадству, а не выбраным асобам. Рада вырашыла, што зарплата войту застаецца такой жа як дагэтуль.

Уладзімір Сідарук

Дым над горадам

У Гайнаўцы зімою поўна дыму з вялікіх і малых кацельняў, фабрычных і прыватных. Цяпер, узімку, у печах паляць у жылых дамах. У горадзе на ўскраіне Белавежскай пушчы ў паветры кружыцца сажа.

У вілах спальваюць дровы, стружкі, пілавінне, вугаль, кардон, паперу ды аўтамабільныя або веласіпедныя шыны. З апошніх вельмі едкі дым развейваецца па жылых кварталах.

Праўда, у горадзе за апошнія гады многа кватэр у шматпавярховых дамах падключылі да пасёлкавых кацельняў, між іншым, па вуліцах Новаваршаўскай, Ліпавай і 3 Мая. Але нават і ў іх дакучае смярдзючы дым, які ўціскаецца цераз вокны і дзверы.

Толькі летам паветра ў горадзе больш чыстае ды неба сіняе. А зараз у Гайнаўцы многа дыму.

(яц)

З новым пасведчаннем асобы

У сувязі з новым заканадаўствам аб уліку насельніцтва, з 1 студзеня 2001 года грамадзяне Польшчы атрымліваюць новыя пасведчанні асобы. Да 17 кастрычніка 2002 г. новыя дакументы атрымалі 162 жыхары Арлянскай гміны. У першую чаргу былі гэта асобы, якім споўнілася 18 гадоў і якія патрацілі стары дакумент, а таксама тыя, што мянялі асабовыя даныя і — з-за невялікай чаргі — усе ахвотныя.

Новае пасведчанне, выкананае з сінтэтычнага матэрыялу, нагадвае крэдытную картачку. Яно змяшчае здымак і подпіс уладальніка, асноўныя улікавыя даныя дакумента і шматлікія засцярогі ад фальсіфікацый. За новае пасведчанне трэба заплаціць 30 злотаў і крыху пачакаць; гміннае бюро прымае заяўкі на новы дакумент, уводзіць даныя ў камп'ютэр, пасылае іх у Цэнтр персаналізацыі дакументаў у Варшаве, а ўжо адтуль новыя пасведчанні пасылаюцца ў тую гміну, з якой паступіла заяўка.

У арлянскім бюро чэргаў за новымі дакументамі не відаць.

Міхал Мінцэвіч

Наша Крынічнае

— Пайду ў рай, то за тое, што не ведаю ніякага начальства! — прывітаў нас жартам Янка Брыль.

Дарогу ў Крынічнае меў паказаць нам сам начальнік міліцыі ў Міры. Спачатку ён узяўся тлумачыць, як і куды ехаць, дзе павярнуць. У канцы махнуў рукой:

— Завязе вас мой чалавек, — рашыў, — ён будзе ехаць спераду на сваёй машыне, а вы — ззаду.

У нашай кампаніі ўзнікла паніка.

— Да Янкі Брыля з міліцыяй?!

Наш візіт меў сяброўскі характар. Анна Сабэцкая, перакладчыца Брыля на польскую мову, ехала з шампанскім. І мы з букетам кветак (ад Веры Касмовіч) хацелі павіншаваць пісьменніка з 85-мі ўгодкамі.

— Віншаваць, з міліцыяй... — выглядала на тое, што ў гэты раз мы самі сябе *падставілі.*

За Мірам наш „міліцыянт" знік з вачэй, карацей, ён павярнуў у поле, дзе капалі бульбу.

* * *

Блуканіна ў лесе, здавалася, ніколі не скончыцца.

Мы ехалі пясчанымі дарогамі, а за намі цягнуўся шэры хвост пылу.

— Савецкія пісьменнікі, — фантазіраваў Юрась, — у дастатку ды ў палацах жылі.

Пад яго ўплывам мы ўжо „бачылі" дачу Брыля як харом з мармуровымі калонамі і пародзістымі сабакамі.

У пачатку вёскі нас падтрымалі ў мроі:

— Ён у белай мураванцы жыве, у канцы.

Лакалізацыя „палаца" ў канцы вёскі паказалася недурной. Вядома не ад сёння, што пісьменнікі любяць падыхаць прасторай.

Мы пераехалі ўсё Крынічнае і не знайшлі двара, які пасаваў бы да расказаў сябры.

— Пайду і спытаюся ў людзей, — пайшоў па розум Вячаслаў. Ён зайшоў пад тыповы дачны домік, белую мураванку з ганкам.

Вячаслаў доўга круціўся каля дачы, абышоў яе кругом, пастукаў у акно.

— Гэта тут! — абвясціў тонам пераможцы.

Па чым пазнаў дом пісьменніка? На ганку ляжалі гадавік „Нашай Нівы" і беларускія кніжкі.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Янка Брыль (у цэнтры) паказвае свае любімыя месцы

Праз момант сустрэў нас сам Янка Брыль.

— Вандруем слядамі класікаў, і не маглі вас мінуць, — прадэкламавала Лена.

— Класікаў у нас развялося! — пажартаваў Брыль і запрасіў у свой дом. Найперш — у садок са спелымі яблыкамі.

* * *

За сталом мы гутарылі пра новы літаратурны часопіс „Дзеяслоў". Зараз, калі пішу гэтыя словы, „Дзеяслоў" ляжыць перад маімі вачыма. Чытаю лірычныя запісы Янкі Брыля і зноў бачу Крынічнае. Там вясна, радасць.

І тая знаёмая дарога з аўтакаляінамі, па якой ідзе з намі пісьменнік паказаць бярозку, што вырасла з сярэдзіны пянька зрэзанага дуба.

Шырокія аўтакаляіны прылясной дарогі ўтапіліся ў павышэлай ад дажджоў траве, замест ранейшага пылу на іх, цяжкага для хады, гладкая ўезджанасьць, па якой ідзецца тупка.

Ня толькі мне.

Павярнуўшы з двара на дарогу, заўважыў воддаль у каляіне... бусла. Так проста гэта і так незвычайна, ніколі нябачана, каб і ён уладзіўся прайсьціся!... А мне прыйшлося яму перашкодзіць, хоць я спачатку пайшоў і павальней. І раз, і два азірнуўшыся на мяне, буська нясьпешна, але ж і абачліва падскочыў, залапаў крыламі ўшырыню, на выгляд цяжка ўзьняўся, пашыбаваў над дарогай і ўзьлескам, пад раньняе сонца, туды дзе асядзе чырвонымі цыбамі на рослазялёнай роўнядзі, закіне дзюбу ў неба і зойдзецца шчасьлівым клёкатам-сьмехам.*

* * *

На ганку, дзе іграліі цвыркуны, дзяўчаты ўміг падрыхтавалі застолле (Янка Брыль быў у клопаце, жонка пайшла ў лес па брусніцы).

Мы праспявалі юбіляру „Многая лета", а сам Янка Брыль узнёс слаўны ўкраінскі тост:

— „Хай будэ грэчка"!

Дзеля кампаніі, па-юбілярску, пісьменнік *пацалаваў* чарку. Болей — як прызнаўся — не дазваляе здароўе.

— Ці ў Мір, на Свята пісьменства збіраецеся?

— У мяне хворыя ногі, а там стаяць трэба, — адказаў.

Гутарка пра беларускае пісьменства цяжкая і сумная як на юбілейныя сустрэчы. З новым навучальным годам планавалася закрыць 230 сельскіх школ, у асноўным беларускіх. Са школьнай праграмы міністэрства адукацыі прыдумала выкінуць творы Васіля Быкава.

— Чаму няма пратэстаў?

Замест адказу мы пачулі пытанне-дакор.

— Дзе пра гэта можна сказаць?

Сродкі масавай інфармацыі не кранаюць цяжкіх пытанняў. Ды і тое, што выплывае на верх гэта малы фрагмент рэчаіснасці.

* * *

Янка Брыль — класік і „жывая легенда", аўтарытэт усіх пакаленняў беларусаў.

Нарадзіўся 4 жніўня 1917 года. Яго родная вёска — Загорра, недалёка Міра. Ад 1983 года прыязджае на дачу ў Крынічнае, дзе праводзіць час з вясны па позную восень. Тут нарадзіліся многія творы, у якіх адлюстраваная жывапісная прынёманскага кута.

Пісьменнік паказаў свае любімыя месцы. Дуброву над Нёманам, якую калісьці пасадзіў старшыня калгаса — рамантык. Маляўнічы бераг Нёмана з панарамай даліны. Здзівіў нас знаёмы вобраз. Тут на высокім беразе відаць Залучча Сыракомлі.

Наша Крынічнае.

Да ўсяго прывыкаеш. Салаўёў яшчэ застаў, але запісваць не пацягнула.

*А жураўліны пераклік за Нёманам, дзе лугі тым часам дружна пайшлі ў зеляніну ад начных і дзённых дажджоў, чую кожную раніцу з дарогі ў пасёлак, як быццам без хваляваньня, як штосьці звычайнае, неад'емнае.**

Што ж, на дваццатай тут вясне.

Ганна Кандрацюк

* Янка Брыль, *Вясна*, „Дзеяслоў", № 1, верасень 2002 г.

Сапраўдны сцяг



Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

Мая на дзесяць гадоў малодшая сястра паступіла сёлета ў першы клас пачатковай школы. Калі з боку школы выйшла прапанова, каб першакласнікі вывучалі беларускую мову, мы не мелі ніякіх сумненняў і запісалі Олю на заняткі, тым болей, што і яна ахвотна згадзілася. Мы думаем, што чужыя мовы ведаць варта, а сваю — трэба. Відаць, іншыя бацькі па-іншаму гэтае бачаць. Кажуць яны, што дзве дадатковыя гадзіны ў тыдзень могуць быць іх дзецям перашкодай у навуцы. Таму з І-ІІІ класаў на беларускую мову запісаліся толькі 9 дзяцей.

Ад гэтага часу Оля кожны тыдзень прыбягае дадому шчаслівая, што „ўжо ведае", „ужо навучылася". Аднойчы сястрычка з самага парога паведаміла сям'ю (аб'ектыўна кажучы, суседзі пэўна таксама пачулі...): „ А я ўмею спяваць беларускую песню!!!". Як няцяжка дадумацца, была гэта „Люблю наш край". Класіка. Заглядаю ў сшытак — там усё як трэба: тэкст песні (лацінкай!) васілёк, бярозка, бусел... „Гэта беларускія сімвалы", — растлумачыла малая. „Олю, а гэта што?" — паказваю на бел-чырвона-белы сцяг. „Ты ж ведаеш! Гэта таксама сімвал — гэта сцяг". „А што дакладна гэтыя сімвалы сімвалізуюць, казалі табе"?

Не, не казалі. Оля не ведае, чаму беларускім сімвалам ёсць якраз бяроза або, хаця б, бел-чырвона-белы сцяг. Я, шчыра кажучы, крышку здзіўлялася, што дзяцей вучаць пра сцяг. У маім дзяцінстве на беларускай мове таго ў праграме не было. Дакладней, у гэтай праграме ўвогуле нямнога было. Добра, што прынамсі чытаць і пісаць па-беларуску мяне навучылі. Пра нацыянальныя сімвалы затое даведалася я ўжо ў першым класе белліцэя (на восем гадоў пазней чым мая сястра!). Настаўнік растлумачыў нам паходжанне і значэнне Пагоні і бел-чырнона-белага сцяга... Падумайце, якое было маё здзіўленне, калі выпадкова ў энцыклапедыі знайшла я сцяг у зусім іншым, незнаёмым і на нішто непадобным выглядзе! Нават зараз помню, як настаўнік „выкапаў" тады недзе з кладоўкі моцна запылены БССРаўскі сцяг, які, дарэчы, не вельмі адрозніваецца ад актуальнага афіцыйнага.

Пабачыўшы ў сшытку сястры гістарычны сцяг, сцвердзіла я, што мабыць, выхоўваюць мне Олю на патрыётку. Мо, падумала я гэта ў кепскую хвіліну, бо неўзабаве сястра прыбегла задаволеная і спытала: „А ведаеш, як выглядае сапраўдны сцяг Беларусі?" — „Ведаю, бел-чырвона-белы..." — „А не! Гэта сцяг беларусаў у Польшчы, а сапраўдны сцяг сапраўдных беларусаў у Беларусі — зялёна-чырвона-белы!" — „А што ён абазначае?" Ізноўку не ведала. Папытаўшы ў настаўніцы, адказала мне, што гэта сімвалы бітвы, крыві, свабоды.

Ці сямігадовыя дзеці павінны вучыцца пра такое? Вядома, што не могуць яны і доўга яшчэ не будуць маглі зразумець складанасці сітуацыі беларусаў па абодвух баках мяжы. Ці варта ўвогуле ў першым класе пачатковай школы кранаць такія тэмы, якіх немагчыма дзіцяці па-сапраўднаму растлумачыць? Чаму першакласнікаў у пачатковай школе трактуюць як дарослых? А чаму нас, у белліцэі, трактуюць часам як дзяцей? Нам жа таксама ніхто надта многа не тлумачыў...

Яўдося

Літаратурна-мастацкая старонка № 512

Віктар Швед

Янку Крупу

„Лявоніху", сваю эстраду,
Чакаў з прыездам наш народ.
Вітаў ён песню, танец, радасць
І суцяшэнне ад турбот.

Вітаў славутага танцора,
Што сіл не шкадаваў сваіх,
Як птушка лётаў у прасторы
І ачароўваў заўжды ўсіх.

Ён плыў з партнёркаю па сцэне,
Як казачная прыгажосць,
І выклікалі захапленне
Задор, майстэрства, маладосць.

Гадочкаў прамінула многа...
Састарыўся і наш танцор.
Адтанцаваў ён свае ногі,
Кіёчкам іх ужо падпёр.

Пакуль жыць будзе асяроддзе,
Пакуль народ наш не памёр,
Жыве „Лявоніха" ў народзе,
Услаўлены і наш танцор!

Ён будзе жыць у пакаленнях,
Якія захапляў на здзіў,
Хто з нас у большае ступені
Сябе народу прысвяціў?

Аляксандр Вярбіцкі

Пасядзеўкі

Апан, ледзь досвітак, выйшаў касіць траву. Гэтую дзейнасць выконваў ён колькі ўжо гадоў. Бывала, касіў ён з пад'ёмам, з натхненнем, якое можа спадарожнічаць толькі жыццерадаснаму земляробу; нат спыняўся і падспеўваў *Касіў Ясь*. Але сёння касілася яму марна, бо час маладога аптымізму мінуў. Ягоная Апані гадоў пару назад адышла даглядаць Задыяк, пакідаючы на ягоныя плечы ўсё рагатае і нерагатае. Былі яшчэ дзве дачкі, Адоня і Бадоня, але яны зусім не квапіліся пераймаць бацькоўскае.

— Каб іх халерыя, — думаў у адчайныя хвіліны Апан, — да ніякай работы не загоніш іх, на ўсё крывяцца.

Апан гадамі віў з Апаняй сваё жыццёвае гняздзечка. І, як большасць дбайных бацькоў, марыў перадаць тыя свае мужыцкія харомы дзецям, бо сам ужо з сіл збіваўся. Ягоныя дочкі, аднак, як і большасць маладых людзей, былі настроены рэвалюцыйна, адкідаючы бацькоўскія парадкі і марылі пра збудаванне сабе зусім іншай светлай будучыні.

Адоня і Бадоня былі ўжо ў тым узросце, калі трэба ўсур'ёз заваблівацъ нейкіх кавалераў. І яны ўсур'ёз пра тое і думалі. У іхняй вёсцы кандыдатаў для жаніцьбы было хоць адбаўляй, але такая перспектыва — з нябрытымі і падвыпітымі гнаядзёрамі — іх не вабіла. Вось у тэлевізары паказвалі зусім іншы свет, дзе ўсё чысценька, а іх равесніцы губляліся ў багацці стройных, маладых і элегантных джэнтльменаў, не ведаючы, у каторага ўлюбіцца. І Адоня з Бадоняй сядзелі ў бацькоўскай хаце, любаваліся тэлевізарным шыкам, а бацькавы намёкі, каб яму ў нечым дапамаглі, напаўнялі іх агідай. Дзяўчаты сядзелі ў хаце, бо гарадской работы не было ды яны і не шукалі яе. Толькі марылі, што прыедуць нейкія казачныя прынцы, якія і забяруць іх у той элегантны свет, дзе нічагуткі не трэба рабіць, а адзінай турботай з'яўляецца перабор стройных маладзёнаў. І яны, Адоня з Бадоняй, былі напагатове ўзнагародзіць сваіх дабрадзеяў тым, чаго патрабуюць тыя сапраўдныя мужчыны. Праўда, праз іхнюю вёску ездзілі на іншамаркавых машынах замежныя бізнесмены, прапанавалі сігарэты і гарэлку, але месцы побач іх былі ўжо занятыя і лішні груз іх не цікавіў.

Апан прыгадваў свае юначыя гады, калі дома было строгае падпарадкаванне бацьку, а спробы парушэння гэтага парадку перасякаў шыцік.

— Любі як душу, а трасі як грушу, — рашыў ён завесці працоўную дысцыпліну і страсянуў абедзве свае доні.

Але яны не кінуліся дапамагаць бацьку ў працы, толькі кінуліся да тэлефона і паведамілі паліцыю, што бацька парушае закон, знуткуючыся над імі, бедалагамі.

Ратаваць сям'ю ад здзекаў бацькі паехалі праз нейкі час два паліцыянты: Абой і Бабой; былі гэта маладзенькія хлопцы з суседніх вёсак. Яны таксама, як і дочкі Апана, любілі глядзець тэлебачанне. Але маладзёны глядзелі баевікі, як па вуліцах Сан-Францыска ці Сан-Карласа ганяліся за гангстэрамі паліцыянты (або наадварот) — усе з агнямётнымі рэвальверамі. І марылі, што і яны, страляючы направа і налева, будуць наводзіць належны парадак на вуліцах суседніх вёсак.

Апан разбіваў пакосы, калі ўбачыў паліцэйскую машыну. Кінуўся ўцякаць, але маладыя ахоўнікі правапарадку з набітымі пісталетамі ў руках скора яго дагналі і, узорам тэлевізарных герояў, рашылі выкрунуць яму рукі. Калі так тузалі яго, з Бабоевага пісталета раздаўся выстрал. Бабой убачыў перад сабою — заміж тэлевізарных рэклам у такі момант — закрываўленага канаючага калегу.

Перад Абоем паказаўся Святы Пётр з залатым званочкам у руцэ. Пазваніў і зараз сталі перад ім Святы Францішак са Святым Каралем.

— Вы што пра яго? — спытаў Святы Пётр.

— Наш хлопец! — усклікнулі апекуны баевіцкіх гарадоў.

Прыляцелі анёлы і палуналі Абоя ў рай.

Апан ужо нікуды не ўцякаў. Засудзілі яго пасля на тры гады, але не за ўдзел у палявой схватцы, але за ўдзел у дамашняй. Пайшоў сядзець і Бабой.

Адоня з Бадоняй таксама сядзелі, у бацькоўскай хаце. Надалей выглядалі яны ў тэлевізары прынцаў, якіх дон Францыска ці дон Карласа, як калісь іхнія прабабулі выглядалі ля вадапою казацкіх ездакоў ад сіняга Дунаю.

Мацей Халадоўскі

Прабуджэнне

Памятаюць у вёсцы, як Алег прадаў апошняга бычка. На гарэлку прыехалі нават з гміны. Бабулі Свеце ў нядзелю нараніні ў галаве так шумела, што на абедню не дайшла. Першы раз. У царкву дык нікому не было па дарозе. Нічога не памагло біццё ў званы.

— Бум-бум. Бум-бум, — гудзела ў Алегавай галаве. Уціснуў яе пад падушку. Спрабаваў даспаць, адаспацца, пераспаць, заспаць. Як жыць без грошай, без жонкі Валі, без сынка Пецюхны, без бычка? На прасціну паплыў салоны пацер. Царкоўны звон, бы ўчуўшы Алегаву скруху, змоўк. Ды цяпер аканіцы ўсчалі свой танец. Нават бляшанка з-пад сялёдак не справілася з іхнымі енкамі. Ледзь шыбу не выбіла. І Алег заенчыў:

— Шумеў камыш, дзярэўя гнуліся, а ночка цёмнаю была.

За акном, заляпаным сялёдачным алеем, сняжынкі, бы вялікія мухі ў начных кашулях, ляпаліся ў няскошаную атаву. Узбоч плота прамільгнуў Васька. Калісь мурлыкаў ён у сенях, лашчыўся ля Пецюхнавых ног. Васька не перанёс Алегавага начнога храпу і ранішніх выспяткаў у сваю кашэчую спіну.

— От, пракляты сабака! — прамармытаў Алег, ледзь давалакаючыся да акна. Кроплі бамбілі з кухоннага крана стус заклееных шклянак і шчарбатых талерак.

— Піць! — узвыў.

Перанёс чарэп'е на стол, благальным жэстам склаў далоні, і на іх сплыла спачатку ржава-мутная, ды зараз крынічна-чыстая вада. Сярбаў, аж займала дух. Выцер далоні ў кашулю. Два тыдні ў ёй спаў, хадзіў, не расставаўся з ёю, бы ў маладосці з жонкай. Гэта кашуля гэтак аддавала. Ды таго з-за прылаўка геэсаўскага бара не разумела Крыстынка.

— Пайшоў бы. Працверазеў. Памыўся б. А то нясе ад цябе, як ад тае пароснае свінні, — намякала колькі дзён Алегу.

Таго, што сасмердла кашуля, а не сам Алег, можа і Крыстынка не разумела, але добрае слова і чарку напавер заўжды мела ў запасе.

— Ты скажы, Алег, ну, ты да Крыстынкі, ці да чыстай так штодзень вочы лупіш? — папракала яго Валя.

Спачатку прабаваў агрызацца. Пасля адпусціў. Яна — у крык. Ён — за кажушок, ды з хаты. Як выйшаў, моўчкі, на святых Кузьмы ды Дзямяна, Валя ўзяла за руку Пецюхну. У другую ўхапіла два кулькі са шматкамі і пайшла прэч да цешчы. І толькі яе бачыў.

Як і штодзень, Алежка ўскаўзнуўся ў штаны. Перавязаў іх надтрэснутай дзягай. Прылізаў ускудлачаную бараду, выраслую на ім як на бацьку Аляксею, што бамбіў на трывогу. Абуў палопаныя чаравікі. Закінуў на спіну кажушок. Ляпнуў дзвярыма. Было ўжо каля поўдня, бо само Караткевічыха вярталася ад жонкі Сяргея. Заўжды гадзінку да абеда пабалбочуць, бы тое жыццё кацілася разам з гонкай аўтафураў па шашы за вёскай.

Перабягаў між хатамі, бы той Васька паўз плот. Дайшоў да Сяргеевага поля, пад шашой. Сонца біла ў вочы. Ступакі прамоклі ад таючага снегу. Стала Алегу блага...

Прачнуўся, рыхтык дурны. Здалося яму, што ў блакіце пятнаццаць зорак заззяла.

— Ну, як жа гэта так? То ж дзень яшчэ.

Прабаваў падняцца, ды якаясь сіла не адпускала яго ад зямлі.

— Устань ды ідзі! — пачуў за спіною. — Усё — марнасць марнасцей.

Алег адвярнуўся памаленьку, не ўстаючы, аднак, бо і чаго ж? А што, як возьме ды паваліць яго зноўку на зямлю тая таемная моц? І дзіву даўся. Стаяла перад ім святлістая постаць, ні то жана, ні муж у навочніках бы тэлескоп.

— Хай цябе ляк не агортвае, — нахілілася над Алегам тая незвычайная асоба. — Я — камісар Нябеснага саюза. Прыбыў я збавіць цябе ад грахоў тваіх і не па тваёй віне ўчыненых. Нябесны саюз прыслаў мяне, каб табе дарогу паказаць. Паследуй за мной!

Алег яшчэ больш дзіву даўся. Ды лёгкасць нейкая ў яго ўступіла, і ўстаў ён.

— Час пасціць. Не будзеце ні мяць, ні жаць, — і камісар скіраваў у бок шашы. А за ім — Алег.

Не мінула і паўгода, як над Алегавай вёскай неба засрэбрылася. Дрэвы прамовілі бутонамі, а расшчабятанае птаства рушыла ў бяседу на палетках. У апусцелы Алегаў дом ужо ад Каляд ніхто не заглянуў. У свята паявілася была там Караткевічыха, два тыдні раней, на каталіцкія Каляды — Крыстынка. Стукалі ў дзверы, грукалі ў акно. Ні прывета, ні атвета. Праз апырсканае граззю акно відаць было толькі запэцканыя, параскідваныя па стале чарапкі.

У пятніцу перад поўднем у Крыстынчын бар увайшоў стары лістаноша Валік.

— Ёсць у мяне табе ліст, Крыстынка, — кінуў ужо з парога.

Сяргей з пляменнікам Андрушам абмяркоўвалі за столікам гешэфт. Важны быў. Крыстынка ўжо трэцюю чыстую ставіла.

— Мне? А ад каго ж ён можа быць? — здзівілася.

— Калі здалёк, дык, мусіць, штосьці важнае. Можа табе, Крыстынка, спадчына якая дасталася? — уключыўся Сяргей.

Дзяўчына выцерла далоні ў фартух. Прыгледзелася да маркі з прыгожым замкам, якіх у нас і не ўбачыш. Не адразу ліст той адкрыла. Пайшла за буфет. Узяла нож. Расцяла канверт. Прысела. Высунуўся маленькі лісток з малюнкам ружы. Сяргей з пляменнікам ды Валік глядзелі моўчкі. Крыстынка чытала, а вусны ў яе варушыліся: „Мілая Крыстынка! Лёс мяне пагнаў у свет. Дык я так і ёсць у гэтым свеце, і паводзіцца мне добра. Вечарамі за вамі сумую. Здаецца, вяртацца не буду. Пасылаю табе 200 даляраў. Гэта за тыя чаркі, і каб сабе ты штосьці купіла; усё за тваё добрае сэрца. А тыя 500, якія атрымаеш, Вальцы аддай. Хай Пецюхну ў школу „выпраўку" купіць. Алег".

— А нашто мне тыя твае даляры, дурань! — прашаптала Крыстынка.

Слёзы яксьці так самі па сабе паплылі.

— Ну, і што, спадчына? — беспардонна прабаваў падысці дзяўчыну Сяргей.

— А вы толькі пра адно: грошы ды грошы! — Крыстынка ўстала і са злосцю выкінула з сябе: — Чалавека праз тыя грошы ўвогуле не бачыце! Чалавеку, калі добры ён, дык свет дабром адплаціць. Не сёння, дык пасля. Не тут, дык там. Бо ж справядлівасць быць мусіць...

Крыстынка адвярнулася спіною да залы. Узяла шклянку і анучку. Церла яе ўсё мацней ды мацней. Аж раздушыла. Шкло ўбілася ў палец. Пацякла кроў.

— Справядлівасць мусіць быць, — пераконвала сябе самую Крыстынка і смактала паранены палец. — І ёсць.

Зорка

старонка для дзяцей

Радзік і карабель мараў

Радзік Мацієвіч, наймалодшы ўдзельнік Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы, ужо другі год запар атрымаў вылучэнне. Радзік ходзіць у другі клас Пачатковай школы н-р 6 у Беластоку.

— Верш пра сабачку Рэшку — гэта пра вашага сабаку?

— Так, Рэшка гэта наша сучка. Яна нарадзіла нядаўна чацвёра шчанят.

— Здаецца, паміж табой і Рэшкай ёсць сяброўства?

— Я люблю жывёл. Калі буду дарослы, хачу стаць ветэрынарам.

— Я думала, што касманаўтам? Маю на ўвазе іншы твой верш — „Карабель мараў".

— Мяне цікавяць зоркі і планеты.

— Хочаш паляцець у космас?

— Не.

— Чаму?

— Не ведаю.

— Скажы нешта пра зоркі і неба.

— Ведаю ўжо, як пабудавана наша сонечная сістэма. У яе цэнтры — Сонца, усе іншыя планеты кружацца навокал яго.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Радзік з Рэшкай

— А іншыя зоркі, якія ноччу на небе?

— Яшчэ не ведаю...

— Якія купіш сабе кніжкі — пра зоркі, ці пра звяроў?

— Кнігі пра космас, пра дыназаўраў, пра розных іншых звяроў, энцыклапедыю геаграфіі...

ЗОРКА

Вершы Віктара Шведа

Кантракт

Спынілася ў школе праца,
Летні настаў адпачынак.
Пасведчанне хоча ўбачыць
Бацька гарэзнага сына.

— Будзь задаволены, тата,
Гэта ж яшчэ не крамола.
Мой кантракт з класам пятым
На год прадоўжыла школа.

Удалося

Настаўніца мае праблему.
Яна запыталася Алю:
— Скажы, якую мы тэму
З граматыкі прарабілі?

— Займеннікі — на бягуча.
— Дай прыклады нам, Міхалэк.
— Хто? Я? — збянтэжыўся вучань.
— Дык гэта ж дасканала!

Радаслаў МАЦІЕВІЧ

Карабель мараў

Быў сабе карабель.
Заўсёды марыў паляцець.
Аднойчы прыехалі людзі
І селі на касмічны карабель.
І яны марылі ад дзяцінства,
Каб паляцець.
І паляцелі.
Першы быў Месяц.
Пасля быў Марс.
А там нічога не было,
Толькі яны адны.
Даходзіла ўжо сёмая гадзіна.
Селі ў ракету, з'елі вячэру,
Якая лятала па кабіне ў скрынцы.
І вярнуліся на Зямлю.
Так закончыўся палёт мараў.

Пра сабачку, які называўся Рэшка

Быў раз снежань, 31 дзень.
Даходзіла поўнач.
Пачалі страляць феерверкі.
Рэшка схавалася пад ваннай.
Нічога яшчэ не гаварыла,
Толькі скуголіла ад страху.
Пасля вылезла з-пад ванны,
Прыйшла ў вялікі пакой.
Пачаставалі яе каўбаскай.
Рэшка сказала „Дзякуй!"

Польска-беларуская крыжаванка № 48

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Halas					Park / Zapach				Komisarz
	Golec / As	Jak / Krzak		Panorama / Mewa				Aksamit	
			Mars / Kawa						
Lakier / Sukienka									
Związek	Sowa							Kran	
	Twarz					Iks			
	Juka	Jak		Aster					
							Ar		
	Karawana								

Адказ на крыжаванку н-р 44: Скок, ваш, ватоўка, зрок, стук, квадрат, вока, рука, панарама, Ас. Сок, квас, звон, рака, водар, акр, востраў, аўт, шкурка, акраса.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Эвеліна Прабуцкая** і **Сільвія Анджэюк** з Нарвы, **Ева Шырэнос** і **Юліта Сахарчук** з Бельска-Падляшскага, **Аня Артэмюк** з Парцава, **Марцін Аляксандрук**, **Івона Трафімюк** і **Міхал Гацута** з Новага Корніна. Віншуем!

Місь Мішка

Рана мама Мішку выслала па мёд,
а ён замест у лес
пайшоў у агарод.
Знайшоў салату, агуркі,
і памідор яркі,
капусту, пятрушку
і зялёную грушку,
а мёду нідзе няма.
Пайшоў у хату Мішка,
а там мама, тата і дзед,
ядуць сабе абед.
Ядуць і мёд.
І ўспомніў сабе Мішка, што ён
пайшоў не ў лес, а ў агарод.
І так прапаў ягоны мёд.

Моніка АДАМЧЫК,
V „б" кл. ПШ у Гарадку

Свята школы

8 лістапада 2002 г. мы адгулялі Свята школы. У 9^{00} гадзін усе сабраліся ў гімнастычнай зале, каб паглядзець спектакль „Гномікі". Акцёры (вучні VI „ц" класа) крыху спяшаліся, але паказалі нам усё як найлепш. А спяшаліся на конкурс у Беласток. Яны паехалі, а мы... разышліся па сваіх класах. Там завяршалі пластычныя працы на тэму „Мая малая і вялікая Айчына". Справа важная і прэстыжная, нашы працы на калідоры глядзелі госці, настаўнікі і сябры. Пасля быў працяг артыстычнай часткі. Мы паказалі спектакль „Кірмаш у Гарадку" (дзеянне адбываецца ў міжваенны перыяд). Былі там: яўрэй, немец, пан, пані, селянін, гандлярка. Былі сваркі, торг і звычайныя размовы на розных мовах. Было шумна і голасна. Прадавалі і куплялі. Спектакль, здаецца, усім спадабаўся. Да выступлення рыхтаваліся мы даволі доўга, а ўсё мінула так хутка. Шкада, ой, як шкада.

Вучні VI „а" і VI „б" класаў
ПШ у Гарадку

Дзённік Міколы

Хлус-кант

Па дарозе ў школу я сустрэў Аню. Яна ішла хуткім крокам і пазірала на дзівосны прадмет.

— Што, глобус нясеш? — я прывітаўся з сяброўкай, але яна кіўнула адно галавой і маўчала. Мы спяшаліся ў школу.

— Сапраўды хочаш ведаць? — азвалася ўрэшце Аня.

— Вядома, — кінуў я, але Аня маўчала. Яна чакала большага зацікаўлення з майго боку.

— Ты ўчора прыбіраў у сваім пакоі? — ні з таго, ні з сяго спыталася Ляшчынская.

— Вядома! — адрэзаў я і падумаў, што Аня расхварэлася ад думак пра конкурс жывапісу.

— Ты маніш, коцік, — сказала цвёрда Аня і заглянула мне ў вочы.

— Я... я... я, таго... — запыкаўся я: так, я зманіў! — Адкуль гэта ведаеш?

— Бачыш, — сказала Аня, — гэты прадмет завецца „хлус-кант" і ён служыць для рассакрэчвання лгунства.

— Баю-бай, — адпаліў я сяброўцы, хаця... без папярэдняй упэўненасці.

— Я знайшла яго ў хаце, карацей, у былой хаце Ліняцкіх. Разумееш?

— Ага! — падтакнуў я, хаця нічога не разумеў.

— Гэта чарговы доказ, што Ліняцкія жывуць з чарадзейства, — сказала Аня і больш мы ўжо не гаварылі аж да вечара.

На ўроку геаграфіі спадар Вожык выклікаў мяне да дошкі. Я падрыхтаваў урокі і атрымаў пяцёрку з плюсам. Праўда, бацькам сказаў, што шасцёрку. Зрабіў з сябе дурня.

— Віншую вашага Міколу з пяцёркай, — сказала праз пяць хвілін Аня. У час, калі я абвяшчаў бацькам свой нечуваны поспех, яе „хлус-кант" завыў як вар'ят. Аня прыбегла да нашай хаты і выправіла маю памылку. Пасля гэтага „здрадніцкага" жэсту „хлус-кант" супакоіўся. Бацькі нічога не падазравалі. Мая мама пракаментавала ўсё адным сказам:

— Значыць, усе твае чацвёркі — тройкі! Так?

Мне хацелася крычаць... Аднак падумаў, што мама ў нейкай ступені мае рацыю. Часта мае ацэнкі, перад бацькамі, „павышаліся". Я баяўся, што калі пачну апраўдвацца, зноў адазвецца „хлус-кант".

— Сумняваюся, — сказаў спакойна, але строга тата, — ці ты павінен столькі часу прысвячаць маляванню.

(працяг будзе)

(нак-с)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Урок малявання

Экскурсія ў Музей

У школе, як у школе, вядома, усё трэба вучыцца і вучыцца. Каб зусім не забыць пра навакольны свет, мы вырашылі паехаць на экскурсію. Выбралі Музей малой Айчыны ў Студзіводах.

Прывітаў нас гаспадар музея — Дарафей Фіёнік. У музеі мы паглядзелі фатаграфічную выстаўку Хрыстафора Глівы пад загалоўкам „Грэцыя далёкая і блізкая". Спадар Фіёнік вельмі цікава расказаў нам пра гісторыю і жыццё манахаў на Святой Гары Афон. Мы даведаліся таксама, як узнікалі першыя манастыры на Святой Гары і адкуль прыбывалі ў Грэцыю першыя манахі. Гаспадар музея прыблізіў нам гісторыю вандроўкі Цудатворнай Іконы Іверскай Божай Маці на Афон.

Пасля вучні Гімназіі і Пачатковай школы пабачылі выстаўку „Ткацкія вырабы з вёскі Крывая". У сапраўднай старыннай вясковай хаце мы пабачылі традыцыйнае беларускае адзенне. Гаспадар музея расказаў нам пра тое, як паўставалі ільняныя саяны і сарочкі. Даведаліся мы таксама, як выглядаюць кросны ды як людзі імі карысталіся. Пабачылі мы таксама, як калісьці ўпрыгожваліся хаты на Ражджаство Хрыстова. Вельмі цікавай аказалася гісторыя саламянага *павука*, якога падвешвалі пад столлю ў месцы цяперашняй ёлкі.

Перад ад'ездам мы ўпісаліся ў памятную кнігу. Пасля сардэчна падзякавалі спадару Фіёніку і вярнуліся ў школу. Экскурсію ў Музей запамятаем надоўга.

Юстына Вышкоўская,
III „ц" кл. Гімназіі ў Аўгустове

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Удзельнікі VII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Уладзімір Арлоў, Адкуль наш род

Беларусь і Напалеон

У 1812 годзе французскі імператар Напалеон пачаў вайну з царом Аляксандрам I. Расійскія гісторыкі называюць тую вайну Айчыннай, гэта значыць такой, калі, баронячы Радзіму, супроць захопнікаў падымаецца ўвесь народ.

Але для Беларусі вайна 1812 года была інакшаю. Нашы продкі не лічылі Расійскую імперыю сваёй Айчынай. Яны не хацелі бараніць краіну, якая пазбавіла іх народ незалежнасці. Шмат хто з беларусаў спадзяваўся, што Напалеон дапаможа адрадзіць Вялікае княства Літоўскае.

Пачатак вайны

Для паходу на Расію французскі імператар падрыхтаваў велізарнае 600-тысячнае войска. Напалеон называў гэтую збройную сілу Вялікай арміяй. Хоць войска лічылася французскім, але французаў у ім было меней за палову. Астатнія жаўнеры паходзілі з розных іншых краінаў.

Напалеон быў выдатным палкаводцам і да вайны з расійскім царом Аляксандрам здолеў усталяваць сваю ўладу амаль над усёй Еўропай.

У купальскую ноч 1812 года Вялікая армія пераправілася цераз Нёман, па якім тады праходзіла расійская мяжа.

Праз чатыры дні Напалеон ужо ехаў па вуліцах Вільні. Былая сталіца Вялікага княства сустракала французскага імператара як вызвольніка. Жанчыны закідвалі яго кветкамі, юнакі пыталіся, як запісацца ў ягонае войска.

Першы пад сваімі бел-чырвона-белымі сцягамі ў горад увайшоў беларускі кавалерыйскі полк князя Дамініка Радзівіла.

У тыя дні ў сэрцах жыло шмат светлых надзеяў і спадзяванняў. Мала хто задумваўся, чаму адмовіўся ўдзельнічаць у вайне Тадэвуш Касцюшка, што жыў тады ў Францыі.

(працяг будзе)

Чараўніца

У пэўнай краіне,
у невялікай даліне,
разам з чорным катом
жыла сабе чараўніца
ў хаце агароджанай
старым плотам.
Яна зёлкі збірала,
цудоўныя лякарствы гатавала,
людзям памагала,
дзяцей вельмі кахала.
Калі чараўніца памірала,
некалькі слоў сказала:
„Калі людзі
хочуць быць здаровымі,
мусяць быць
ветлівымі і вясёлымі".

Аня Іванюк, Гімназія ў Нарве

Музыка ўцягнула поўнасцю

Хоць Фестываль „Бардаўская восень" з'яўляецца ўжо традыцыяй, я ўсё ж такі была на ім упершыню. Заахвочаная рэкламай у маёй школе, вырашыла я пабачыць, як у сапраўднасці выглядае „Бардаўская восень". Імпрэза моцна мяне ўразіла. Была там сардэчная, сямейная атмасфера. Але найважнейшае — была музыка, прыгожая ігра на гітары, якая поўнасцю мяне ўцягнула. Наймілей успамінаю выступленне „В. З. Аркестра" з Дзімам Вайцюшкевічам. Гэта яны разварушылі публіку, якая заціхла пасля выступлення Андрэя Мельнікава. Я падумала, што яны — людзі з фантазіяй, а інспірацыю бяруць са славянскай музыкі ды ўносяць у яе сучасныя элементы. Я запамятала таксама выступленне Тамаша Сулімы — лаўрэата другой узнагароды. Цешуся, што маладыя людзі спрабоўваюць сваіх сіл і... з поспехам. Тамаш — найлепшы гэтаму прыклад. Заахвочваю ўсіх да ўдзелу ў „Бардаўскай восені". Я ўспамінаю гэтую імпрэзу вельмі цёпла і напэўна паеду ў Бельск праз год.

Амелія Горбач, вуч. II „б" кл.
Гайнаўскай гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы

Фота МІКОЛЫ ВАЎРАНЮКА

На сцэне Дома літоўскай культуры ромскі гурт „Калэ бала” з Чорнай Гары пад Кракавам

Меншасці ў Пуньску

— Сустрэчы нацыянальных меншасцей надумаліся мы арганізаваць пасля таго, як запрасілі нас на падобнае мерапрыемства ў Варшаву, — расказвае Юрата Кардоўская, дырэктар Літоўскага дома культуры ў Пуньску. — У паўночна-ўсходняй Польшчы жывуць людзі розных нацыянальнасцей. Навошта ім ехаць у Варшаву, калі можна спаткацца ў Пуньску — сталіцы польскіх літоўцаў.

Першы раз меншасці ў Пуньску сустрэліся восенню 1996 года. Імпрэза складалася з дзвюх частак: дыскусіі дзеячаў і канцэрта мастацкіх калектываў. Паколькі пастаноў першай часткі — найважнейшая, стварыць Федэрацыю нацыянальных меншасцей Польшчы — не ўдалося ажыццявіць, дык пазней арганізатары ад яе адмовіліся зусім. Асталася мастацкая частка.

IX Сустрэчы нацыянальных меншасцей сёлета праходзілі 15-17 лістапада. Прынялі ў іх удзел, апрача гаспадароў-літоўцаў, украінцы, немцы, ромы, беларусы (хор „Васілёчкі” з Бельска) і мусульмане. На сцэне прэзентаваліся як фальклор, так і эстрада, песня і танец, розныя мовы, розныя традыцыі.

Мерапрыемства праходзіла ў незакончаным Доме літоўскай культуры, які будуецца ўжо 18 гадоў. (Выразная аналогія з Беларускім музеем у Гайнаўцы. Абедзве ўстановы пачалі будаваць пры іншым грамадска-палітычным парадку, калі ні матэрыялы, ні чалавечая праца не мелі сваёй рэальнай цаны). Вялізны мураваны будынак дома культуры — хоць і меншы ад запланаванага — у мястэчку, якое налічвае ўсяго 1 200 жыхароў, выклікае такое ўражанне, быццам перанеслі яго з іншай казкі.

На пытанне, ці не завялікі ён на патрэбы Пуньска, дырэктар Кардоўская рашуча запярэчвае:

— У нас многа робіцца ў культуры. І патрэбы вялікія.

Такі адказ успрыняў я з лёгкай усмешкай, пакуль не пабачыў, як канцэртная зала на 300 асоб запаўняецца да апошняга месца. Людзі запоўнілі праходы і лесвіцу. Не цяжка падлічыць, што за выступленнямі шматнацыянальных калектываў сачыла чацвёртая частка жыхароў Пуньска. Такога запатрабавання на культуру можна толькі пазайздросціць.

(ак)

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

25-годдзе „Дзявочых нотак”

Пры II Агульнаадукацыйным ліцэі імя Браніслава Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім існуе маладзёжны ансамбль „Дзявочыя ноткі”, які святкуе ў гэтым годзе 25-гадовы юбілей.

Восенню 1976 года па ініцыятыве Сяргея Лукашука, тады настаўніка музыкі і кіраўніка Бельскага дома культуры, створаны быў дзявочы калектыў з 9 першакласніц. На працягу 25-ці гадоў існавання склад гурту мяняўся дзевяць разоў, а выступілі ў ім за семдзесят дзяўчат, якія ў большасці сваю будучыню звязалі з музыкай.

Ад самога пачатку „Дзявочыя ноткі” прымалі ўдзел у шматлікіх конкурсах, напрыклад, савецкай ці гарцэрскай песень, аглядах беларускай песні, з'ездзілі амаль усю Польшчу. Выступілі на больш за 300 канцэртах, фестывалях у Седльцах, Беластоку, Гайнаўцы.

Артыстычным кіраўніком і духовым апекуном гурту быў і застаецца Сяргей Лукашук, які разам з Юстынай Пажазінскай займаецца падборкай і апрацоўкай рэпертуару на працягу ўсіх гадоў існавання гурту. Пачаткова „Дзявочыя ноткі” выступалі з народнымі песнямі пад акампанемент акардэона. Ад дзесяці гадоў калектыў выступае ў эстрадным жанры, а ў рэпертуары паявіліся такія песні як „Пярсцёнак”, „Караблі”, „Дзяўчынка” і самая вядомая — „Тэлефон даверу”.

„Дзявочыя ноткі”, хаця назва паказвае на жаночы гурт, мелі ў сваім складзе і аднаго мужчыну. Быў ім Ян Палавянюк, які цяпер працуе выкладчыкам музыкі.

За 25 гадоў існавання гурт успамагалі ўлады белліцэя — дырэктар Аляксей Карпюк, пры якім паўстаў гурт, цяперашняя дырэктар Зінаіда Навіцкая, Рада бацькоў.

Лаўрэаткамі конкурсаў былі і салісткі „Дзявочых нотак” — Эмілія Астапчук і Анна Хадакоўская, якія цудоўнымі галасамі заварожвалі бельскую публіку ў час фэстаў і беларускіх канцэртаў.

Сёння, так як і ў пачатку, у гурце выступае дзевяць дзяўчат, якія можна назваць прафесіяналкамі. Вялікі ўклад працы, частыя рэпетыцыі прычыніліся да таго, што „Дзявочыя ноткі” заваёўваюць сэрцы публікі, а іх рэпертуар падабаецца як старэйшым, так і малодшым слухачам.

15 лістапада бяльшчане мелі магчымасць паслухаць „Дзявочыя ноткі” ў Бельскім доме культуры. Гасцінна выступіў на бельскай сцэне гайнаўскі гурт „Знічка”, які зрабіў сюрпрыз „Ноткам”, уручаючы ім юбілейныя падаркі і жадаючы далейшых поспехаў.

Гэты асенні вечар стаў нагодай для спаткання „першых нотак”, якія прыбылі на юбілей пасля многіх гадоў расстання. Былі словы падзякі, слёзы і супольныя выступленні на сцэне старэйшых і малодшых удзельніц „Дзявочых нотак”.

Паўліна Шафран

Юбілейны канцэрт „Каласкоў”

16 лістапада стала святам беларускай песні, паколькі 10-годдзе свайго існавання адзначаў маладзёжны хор „Каласкі”, які існуе пры Беларускім грамадска-культурным таварыстве ў Беластоку. А трэцяй гадзіне пасля абеду ў кінатэатры „Форум” пачаўся канцэрт, у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі ўлад — дэпутат Сейма Барбара Цірук і віцэ-ваявода Ежы Паўяновіч.

Ад імя БГКТ юбіляраў і публіку прывітаў старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі наступнымі словамі: „Горад Беласток, апрача Мінска, з'яўляецца самым вялікім культурным цэнтрам беларусаў. Хор „Каласкі” сваёй дзейнасцю выконвае гістарычную місію. Удзельнікі — маладыя людзі: вучні, студэнты, паказваюць свае сувязі з культурай нашага народа”.

„Каласкі” паўсталі ў 1992 годзе на базе старога хору, і, хаця яго склад часта змяняўся, гурт існуе і дабіваецца поспехаў. На ўвагу заслугоўвае асоба артыстычнага кіраўніка і інструктара — Алы Каменскай, вядомай прыхільнікам яе таленту як „падляшскі салавей”, якая працай над апрацоўкай песень, падборкай рэпертуару прычынілася да поспехаў сваіх выхаванцаў.

На сцэне гасцінна выступілі беларускія гурты „Лідэр” і „Прымакі”. Першы з іх разагравaў публіку найноўшымі песнямі, у тым ліку і „Вёсачкай”. Зала паднялася з крэслаў і гучнымі апладысментамі прадэманстравала сваё захапленне. „Прымакі”, як заўсёды паказалі шоу (каментар з публікі), які заключаўся на выступленні з плэй-бэку, падкрэсліваннем слоў песні паданнем на калені перад публікай, якая прымала гэта з ахвотай і... здзіўленнем. Песні „Прымакоў” паднялі публіку да танцаў, чым ахвотна пакарысталася моладзь.

Самым цудоўным, бо толькі гэтае слова можна ў гэтым месцы прымяніць, было выступленне Любы Гаўрылюк, якая спявала пад акампанемент акардэона, на якім іграла яе дачка Ала Каменская. Песня „Верыла, верыла што не разлюбіш мяне” ў выкананні Любы Гаўрылюк, якая цудоўным голасам заваявала публіку, была доказам, што ў зале кінатэатра апынуліся шчырыя беларусы. Нягледзячы на ўзрост, удзельнікі юбілейнага канцэрта спявалі адным, гучным і сапраўды прыгожым голасам. „Гэта ёсць хор!” — аб'явіла спадарыня Гаўрылюк.

Супольнае выступленне Алы Каменскай з сынам Давідам Дубцом заваражыла слухачоў. Была гэта сапраўдная насалода для душы.

Канцэрт можна было б назваць удалым, каб не адна справа. Мерапрыемства вяла Анна Сегень, якая некалькі гадоў таму спявала ў „Каласках”. У вядучай былі вялікія праблемы з правільным прачытаннем тэксту не толькі на беларускай, але і на польскай мовах. Памылкі былі настолькі заўважальнымі, што калі канферансье 12 разоў у якасці асабовага займенніка прымяніла слова „ані” гаворачы аб „Каласках”, хтосьці з публікі не вытрымаў і выгукнуў: у нас няма „ані”, а толькі „яны”. Падобна выглядала справа з БГКТ, якое аказалася не Беларускім грамадска-культурным таварыствам, а беластоцкім. Ці не было асобы, якая добра ведае нашу мову?

Юбілейнае спатканне закончылося, на жаль, вельмі хутка. Разагрэтая беларускімі песнямі публіка стоячы выклікала „Каласкі” на біс, але і гэта не памагло! Канцэрт закончыўся прыемным сюрпрызам — пачастункам з пячэння, якім слухачоў пачаставалі „Каласкі”. Выходзячы з кінатэатра можна было пачуць словы спадзявання, што такога тыпу мерапрыемствы будуць ладзіцца часцей, нават калі няма так важнай нагоды як дзесяцігадовы юбілей!

Паўліна Шафран

Жывем бядуючы

Дарога з Новага Двара ў Бернікі з'яўляецца свайго роду візіткай у „зялёныя лёгкія краіны". За час майго каля гадзіннага паходу па жвіроўцы не сустрэў я ніводнай машыны, адно толькі з аднаго хутара даходзіў выцішаны рокат мотапілы.

Спусціўшыся з высакаватай горкі перад вёскай паказаліся два крыжы: заходні — стандартны дзеравяны і ўсходні — мураваны з царкоўна-славянскім надпісам лацінкай. Стэла апошняга ўваходзіць у стадыю разваліны. Крыж гэты быў пастаўлены жыхарам вёскі, які зараз пасля вайны вымушаны быў выехаць на ўсход. Яго ў 1999 годзе аднаўляў жыхар супрацьпаложанага дома...

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Па берніцкай вуліцы, зараз пры дарозе з Сынкоўцаў і Новага Двара, стаіць імпазантны чыгунны ўсходні крыж. Пастаўлены ён быў у царскі час, але захаваўся выдатна. Распытаць пра яго зайшоў я ў хату, у гародчыку якой той крыж стаіць.

Два мужчыны папівалі піўцо. Жанчына, па-польску, тлумачыла мне, што крыж стаіць так даўно, што пра яго пачаткі ніхто і не помніць. Рашыла, аднак, завесці мяне да мясцовых старажылаў...

Жыццё часам прыносіць нечаканыя сюрпрызы. Акурат пры мне адслужыў свой тэрмін дзвярны замок: клямка круцілася навокал і дзверы немагчыма было адкрыць знутры. Давялося вымаць зімовае акно і выходзіць аконным праёмам...

Згаданы чыгунны крыж быў пастаўлены ў сівую мінуўшчыну; людзі хварэлі і паставілі крыж; адбылося гэта ў дзень святога Марка. І такая ўжо ўсталявалася традыцыя, што ў той дзень, пад канец красавіка, служыцца малебен і ў навадворскай царкве, і ў сідранскім касцёле. Калі бацюшка асвячае пасху, тады перад крыж выносяць стол і там адбываецца той рытуал.

Надпіс на крыжы „ЭТОТЪ ПАМЯТНИКЪ ПОСТАВЛЕНЪ ОТЪ КРЕСТЬЯНЪ ДЕРЕВНИ БЕРНИКОВО ЧТОБЫ БОГЪ ХРАНИЛЪ ОТЪ НЕСЧАСТІЯ" заставіў мяне пацікавіцца сапраўднай назвай вёскі: Бернікі ці Бернікова. Мясцовыя людзі сваю вёску называюць Бернікамі.

Бернікі тры разы ў мінулым стагоддзі гарэлі. Перыяд абязлюдзеласці ў час бежанства будынкі вытрымалі; няшчасці з'явіліся пазней. 2 жніўня 1939 года адна жанчына зацерушыла агонь. Калі праваслаўныя жыхары вёскі вярнуліся з Ячна са свята Ільі, у вёсцы ўжо былі папялішчы.

Неўзабаве ўспыхнула вайна. Немцы ў Бернікі не дайшлі, спыніліся на рацэ Сідры. Насталі саветы і яны ў маёнтку ў Мікелеўшчыне зрабілі калгас і пасялілі туды пагарэльцаў; так жыхары Бернікаў сталі калгаснікамі. Неўзабаве настаў немец і нядаўнія калгаснікі вярнуліся ў сваю вёску, у зямлянкі. Пасля вайны з таго маёнтка ўсё паразбіралі...

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Пад немцам у наваколлі дзейнічала польская партызантка; свае вяскоўцы там хадзілі, нават сутычкі з немцамі былі. Пасля вайны тры сям'і вымушаны былі выехаць у СССР, бо раней з саветамі супрацоўнічалі; выехалі двух Юргеляў і Стаяк. Апошняга прыйшлі забіць, але ён уцёк і пад крыжам прылёг і яго не знайшлі, а пасля выехаў у Гродна. Адзін з Юргеляў перад ад'ездам са сваёй радзімы паставіў згаданы на пачатку крыж.

Пасля вайны калгаса ў Берніках не арганізавалі, толькі чыноўнікі дакучалі: забіралі з гміны зямлю калі хто чаго не вырабіў. І яшчэ два разы хлопцы падпалілі вёску.

Пайшоў я далей па вуліцы. Перад адным з панадворкаў каля расчыненых наўсцяж варот прылёг сабака вялікі як цяля. Калі я праходзіў побач, ён з брэхам накіраваўся да мяне. Я захіліўся сумкай і абышоў гэтыя вароты; сабака вярнуўся на свой пост. Палітычны сабака, падумалася мне, ён жа пільнуе сваёй вотчыны ў Берніках гэтаксама як іншыя славутасці ў Мінску або Празе...

Усёй вёскі, якая з любоўю прытулілася да ўзгоркаў роднай зямелькі, я не абходзіў, але і так відаць тут грамадскую восень. Стадолаў амаль ужо няма, асталіся адно слупы. Калі нават хто яшчэ нешта збірае з поля, дык кладзе ўраджай між тымі слупамі ў стог або піраміду.

Зайшоў я да солтыса. Солтыс з суседам папівалі піўцо; солтысіха рыхтавалася пячы *кашанку* і хлеб.

— Гаспадары ў вёсцы лічаныя, — сказалі мне. — Спецыялістычных гаспадарак няма, няма ніякай работы. Людзі з гаспадарак жывуць. Гарэм і робім, гарэм і робім. Жывем бядуючы, так і ўсе жывуць. Хлеб пячэм, бо хто хоча, той пячэ, а мы свой хлеб любім. Не плачам, кепска няма. Вада свая, водаправода няма, але ў гміне ў Сідры абяцаюць, што ўжо ў наступным годзе праложаць. У гэтым годзе зацягнулі тэлефоны, усе плацілі — ці далёка каму было, ці блізка — па 1 200 злотаў.

Мае сімпатычныя суразмоўцы вельмі гарманізавалі са сваёй ціхай вёскай. Нават солтысаў світэр быў адмыслова падобны на Бернікі: вельмі ж ужо ён ажурны зрабіўся...

Аляксандр Вярбіцкі

Мартыралогія праваслаўя

Гайнаўскае аддзяленне Праваслаўнага брацтва св. св. Кірылы і Мяфодзія і Інстытут праваслаўнай культуры арганізавалі 12 лістапада ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы сустрэчу з епіскапам Люблінскім і Холмскім Авелем на тэму мартыралогіі праваслаўя.

XX стагоддзе з'яўляецца самым трагічным перыядам у гісторыі праваслаўя на нашых землях, — заявіў дырэктар інстытута пратаіерэй Славамір Хвойка. — Прыгадаў ён трагедыю бежанства, у час якога загінула многа людзей. Праслед праваслаўных у Польшчы ў міжваенны перыяд падзяліў ён на тры перыяды. З 1919 па 1924 год у Польшчы былі знішчаны або перароблены на касцёлы каля 150 цэркваў, а ў праваслаўных прыходаў забралі каля 20 тысяч гектараў зямлі. Ад 1929 да 1934 года прадстаўнікі Рымска-каталіцкага касцёла выступілі з многімі судовымі справамі аб перадачы ім цэркваў пабудаваных уніятамі. Перыяд з 1936 па 1938 год — самы горшы для Праваслаўнай царквы. Распачалася тады паланізацыя вернікаў беларускай, украінскай і іншых нацыянальнасцей. Уладамі прымаліся дэкрэты, якія прымушалі, каб богаслужэнні, вучоба ў школах і іншыя праваслаўныя трэбы адбываліся на польскай мове. На працягу двух з паловай месяцаў самай актыўнай дзейнасці людзей непрыхільных для праваслаўя ў 1938 г. былі знішчаны 127 цэркваў. Царкоўнае начынне разбуральнікі рабавалі і нішчылі.

Епіскап Люблінскі і Холмскі Авель выступіў з дакладам „Мартыралогія праваслаўя на Холмскай зямлі". З'яўляецца ён вынікам працы Камісіі па справах правядзення кананізацыі асоб, якія аддалі жыццё за праваслаўнае веравызнанне. Уладыка Авель гаварыў пра жорсткія забойствы свяшчэннікаў і мірнага праваслаўнага насельніцтва ў час другой сусветнай вайны і пасля яе і дачыненне да гэтага польскага падполля.

Калі знайшлі труп айца Паўла Швайко з вёскі Грабавец, былі ў яго выкрунуты ногі, рукі і пабітае цела. Айцу Мікалаю Голецу адрэзалі галаву і павесілі яе на тычцы. Пасля публічна абрэзвалі бараду, язык і вушы. У вёсцы Навасёлкі каля Грубяшова забілі каля 200 праваслаўных вернікаў. Зараз іх косці знаходзяцца на прыватным полі, уласнік якога не спыняе сельскагаспадарчых работ на ім. У вёсцы Вяжховічы таксама забілі многа праваслаўных, а на дзверах царквы распялі сямімесячнае дзіця. Айца Пятра Агрызка вывелі ў палове Літургіі і здзекаваліся ведучы праз вёску. Калі ўпаў, прагналі па ім статак коней і цела яго ўкінулі ў ваду. Цела айца Льва Карабчука, забітага разам з 20 праваслаўнымі вернікамі, знайшлі толькі пасля двух тыдняў. Свяшчэнніка Іаана Капчука забілі, калі не захацеў служыць Літургіі на ўкраінскай мове. Айца Сяргея Захарчука выцягнулі ў 1943 годзе з царквы і перад забойствам знявечылі цела. Пасля нішчылі храм і іконы. Айца Васіля Мартыша забілі 4 мая 1945 года, а айца Аляксандра Бубэра задушылі 26 мая 1945 года.

Уладыка Авель прачытаў яшчэ прозвішчы іншых знішчаных свяшчэннікаў і гаварыў пра забойствы многіх цывільных асоб. Каля 240 тысяч праваслаўных вернікаў вывезлі на Украіну і каля 70 тысяч на заходнія землі Польшчы. У 2003 годзе прадбачваецца праславіць як мучанікаў замардаваных свяшчэннікаў і мірных грамадзян, якія ахвяравалі сваё жыццё за веру ў Хрыста.

Епіскап Авель заявіў, што мучанікамі загінуўшымі на Беласточчыне царкоўная камісія будзе займацца ў будучыні.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Епіскап Авель (справа) і пратаіерэй Славамір Хвойка

У цэнтры — Анатоль Багатыроў

Чалавек мінулай эпохі

Сустрэчы з людзьмі, якіх амаль цэлае жыццё прайшло ў мінулым стагоддзі, надта павучальныя, дазваляюць зразумець нядаўняе мінулае. Я мела магчымасць спаткаць такога чалавека. Гэта выдатны кампазітар, класік беларускай савецкай музыкі, які ў 1938 г. заснаваў Саюз кампазітараў Беларусі — Анатоль Васільевіч Багатыроў.

Доўгія гады сябраваў ён з Дзмітрыем Шастаковічам, у яго доме бывалі Аляксей Талстой, Антаніна Няждана ва, Марк Шагал, Юдэль Пэн. Сустракаўся са Сталіным.

— Ваша жыццё звязана з Віцебскам...

— Віцебск — гэта гістарычны горад, прыгожы, горад мастакоў. Мы жылі на Сеннай плошчы ў вялікім аднапавярховым доме. Пасля рэвалюцыі, інтэлігенцыя, якая не пакінула Расіі, прыязджала ў Беларусь. Таму пасля 1918 г. у Віцебску было многа вядомых і выдатных людзей, як Мікалай Малько, дырыжор Марыінскага тэатра. Віцебск адрозніваўся ад Мінска багаццем мастацкага і творчага жыцця. Знаныя спевакі, мастакі часта бывалі ў нас дома, іграліна раялі.

— Я была на выстаўцы ранніх карцін Шагала віцебскага перыяду, якая цяпер праходзіла ў Мінску. Ці Вы ведалі Шагала?

— Мой бацька, які вучыў музыцы, з ім сябраваў. Марк Шагал разам з бацькам працаваў на мастацкіх курсах у тэхнікуме. Шагал быў малагарадскім яўрэем.

— А Пэн?

— Юдэль Пэн быў настаўнікам Шагала, мастаком.

— Адной з важных фігур мінулага стагоддзя быў Сталін...

— Я з ім пазнаёміўся ў 1940 годзе, калі выстаўлялі маю оперу „У Пушчах Палесся".

— Вы атрымалі за яе Сталінскую прэмію?

— Так. Я атрымаў яе ў 1941 годзе. Оперу я напісаў па „Дрыгве" Якуба Коласа. Опера вельмі спадабалася Сталіну і мяне з жонкай запрасілі да яго на размову.

— Да 1941 г. у Вас былі выдатныя творы?

— Я напісаў кантаты для хора, салістаў і сімфанічнага аркестра, „Казку аб мядзведзі" паводле Пушкіна. Гэта казка была маёй дыпломнай працай.

— Сталін разбіраўся ў музыцы?

— Не любіў эстраднай, падабалася яму класічная. З кампазітараў любіў Чайкоўскага, а з выканаўцаў — Святаслава Рыхтэра і Эміля Гілельса.

— Аднойчы Сталін пазнаёміў Вас з Чэрчылем...

— Так, сказаў тады: „Гэта кампазітар з Беларусі. Піша правільную музыку".

— Як Вы ставіцеся да справы гімна Беларусі? Чыя музыка павінна стаць гімнам; Равенскага „Магутны Божа" ці Сакалоўскага?

— Музыка Н. Сакалоўскага лепшая. Яна адпавядае правілам гімна, але Сакалоўскі не пісаў яе як гімн, а як песню. Крыху яе паправілі, памянялі рытм.

— Скажыце, калі ласка, пра творчасць М. Равенскага.

— Равенскі ў музыцы — прымітывіст, кампазітар малых форм. Першая, пятая, чацвёртая ступень — такая ў яго гармонія. Калі арыштавалі брата Равенскага, ён думаў, што з ім будзе таксама. Але я не даў яго арыштаваць!

— Як гэта было?

— Мяне пазвалі і дапытваліся пра Равенскага. Нічога дрэнага я не сказаў, бараніў і выратаваў яго.

— Як у 30-я гады жылося беларусам?

— Матэрыяльнае жыццё не было важным. Галоднымі не бывалі, але цяпер лепшыя ўмовы. Я жыў у інтэрнаце ў Студэнцкім гарадку. Пасля студэнтаў перасялілі на Камуністычную вуліцу. У Студэнцкім гарадку былі драўляныя аднапавярховыя баракі, якія стаялі за горадам.

— Як тады дзяржава ставілася да кампазітараў?

— Доўга з намі не размаўлялі, не заказвалі операў. Успрымалі нас маладымі і не давяралі.

— Адкуль у Вас бярэцца натхненне, матывы музычных твораў?

— Галоўная ў музыцы мелодыя. Мелодыя — дар ад Бога — музыкі без мелодыі няма. Натхненне бяру з народных беларускіх і рускіх песень. Песню „Палуночак", маю любімую, спявала бабулька. А Ірма Янзан, беларуская спявачка заспявала гэту песню японскаму імператару Хірахіту. Я апрацаваў гэту песню, а Ірма заспявала на беларускай мове. Імператар падарыў ёй свой персцень і наклаў на палец. Ён быў так цэнны, што Ірме забаронена было яго прадаваць.

— Вашы адносіны да сучаснай эстраднай музыкі?

— Падыходжу да яе крытычна, не падабаецца мне і не ацэньваю высока.

— Якіх кампазітараў XX ст. можна назваць геніяльнымі?

— Я выдзяляю толькі трох: Шастаковіча, Пракоф'ева, Свірыдава.

— Хто з Вашых вучняў блізкі Вам па сэрцу?

— Глебаў, Семяняка, Вагнер, Вуйцік — гэта мае любімыя вучні, хаця вучняў маю вельмі многа.

— Скажыце, калі ласка, які музычны жанр Вам найбольш падабаецца?

— Рамансы і опера, кантаты, харавая музыка на змешаныя і мужчынскія хоры. Пішу харавую музыку. Будучы ў Англіі мітрапаліт Сурожскі Антоні Блюм захацеў, каб я напісаў яму творы для царкоўнага хору. Я так і напісаў, але ноты там аставіў.

— Дзякую за размову.

Анна Садоўская

Аб аршанскай бітве

Адгалоскі

У 36 нумары „Нівы" ад 8.09.2002 г. быў змешчаны вялікі артыкул айца Ю. Мыцыка „Бітва пад Воршаю 1514 г.". Можна зразумець, што сэрцам айцоў каталіцкага касцёла і уніяцкай царквы, бітва гэтая блізкая тым, што ў ёй стаўкануліся два войскі, якія амаль у цэласці складаліся з праваслаўных воінаў і заходняя частка іх, падпаўшая ўжо пад уладу каталіцкіх каралёў, дабілася перамогі. Але савецкі гісторык Б. Грэкаў (1882-1953), член Польскай і Балгарскай акадэмій навук, у сваёй „Истории СССР" (том I, стар. 292), напісаў, што бітва гэта не мела ніякага ўплыву на далейшыя падзеі, бо маскоўскія войскі адваявалі Смаленск, а „попытка неприятеля развить дальнейшее наступление была неудачна". Падобна ацаніў вынікі гэтай бітвы і вядомы польскі гісторык Міхал Бабжынскі (1849-1935): „Na nic nie zdały się świetne zwycięstwa z roku 1508 i 1514 pod Orszą (*Dzieje polskie w zarysie*, str. 271, wyd. 1987 r.).

(...) Тое, што ў 1514 г. Канстанціну Астрожскаму (1460-1530) удалося сабраць войскі і дабіцца з імі мясцовай перамогі над маскоўскімі войскамі, можна ў значнай частцы бачыць у тым, што правы праваслаўных у Літве не былі яшчэ так знішчаны і можна было мець надзею на далейшае існаванне праваслаўя на землях намінальнай Літвы. Але пасля злашчаснай Брэсцкай уніі нават сын героя з-пад Оршы, князь Канстанцін Канстанцінавіч Астрожскі (1526-1608) стаў ярым заступнікам праваслаўя і ў душы, напэўна, крытыкаваў свайго бацьку за гістарычную блізарукасць. Крывавыя, доўгія і заўзятыя паўстанні ў 1648-1657 гадах на ўкраінскіх і беларускіх землях паказалі, як адчулі сябе і думалі продкі цяперашніх украінцаў і беларусаў. Гэтыя падзеі, вынікі Брэсцкай уніі, сістэматычная паланізацыя і акаталічванне гэтых народаў, каланізацыя іх зямель і г.д. — усё гэта, па словах знамянітага польскага пісьменніка Генрыка Сянкевіча (1846-1916) „zatruły krew pobratymczą" паміж палякамі і ўсходнімі іх суседзямі.

Мікалай Капчук

Ад рэдакцыі: Гісторыя — пастаянная рэфлексія над мінулым, якая мае дапамагчы зразумець свет. Таму кожнае пакаленне ставіць ёй свае пытанні. Датычыць гэта таксама сучаснай беларускай і ўкраінскай гістарыяграфіі. У апошнім дзесяцігоддзі, пасля распаду Савецкага Саюза, у былых рэспубліках узніклі нацыянальныя гістарыяграфіі, якія асвятляюць мінулае з пазіцый нацыянальных інтарэсаў сваіх дзяржаў. Кожны народ мае права на сваіх герояў, славу, сімвалы. Урэшце гісторыю Беларусі сталі пісаць самі беларусы, а Украіны — украінцы. Таму ацэнка паасобных гістарычных фактаў не заўсёды супадае з меркаваннямі рускіх, савецкіх ці польскіх гісторыкаў, якія Беларусь і Украіну трактавалі з каланіяльна-імперскіх пазіцый.

Да рускіх ставіліся стрымана

Успаміны Станіславы КАНДРАЦКАЙ з Лазова Дуброўскай гміны, народжанай у 1923 годзе.

Да вайны жыды жылі ў гарадах; у Дуброве жылі амаль адны жыды. Перад вайною паявіліся лозунгі „Bij Żyda" і адзін вясковец у Дуброве ўехаў на кані ў жыдоўскую краму, завярнуў там каня і выехаў. Пасля з'ехаліся ў Дуброву маладыя з суседніх вёсак і з крыкам „Bij Żyda" выбівалі вокны ў жыдоўскіх хатах. На рынку адзін праехаўся канём па сталах перад жыдоўскімі ларкамі. У Дуброве было траіх паліцыянтаў і жулікі іх не баяліся.

У тым самым годзе немцы бамбілі гарады і жыды сталі старшэнна плакаць. Калі ўступілі рускія, жыды цешыліся.

Да рускіх мясцовыя людзі ставіліся стрымана. У Садове, дзе я тады жыла, адзін мой знаёмы гаёвым быў, дык яго вывезлі на Каўказ, але пасля ўся сям'я вярнулася.

Гміна тады была ў Дуброве. Назначылі солтыса, а ён назначаў людзей на працу пры пабудове дарог. Пра калхозы ў нас мовы не было, але сялянам назначалі нормы збожжа.

Аднойчы ў нашу хату зайшлі падвыпітыя рускія салдаты, паставілі мяне пад сцяну і хацелі застрэліць. Увайшоў брат, бабуля ўзняла крык і яны выйшлі. Але збегліся людзі, дружныя, звязалі авантурнікаў, праз ноч трымалі іх у склепе, а на наступны дзень адставілі іх у гміну. І тых салдатаў кудысьці саслалі.

Калі наступалі немцы, усе жыхары Садова пахаваліся ў полі. На досвітку супакоілася і я падаіла карову, прывязаную да дрэва. Пайшла дахаты, дома гарэла святло. Усё было перавернута, жарабя бегала на волі, свінні таксама.

Немцы строгія былі, калі што не так, дык вывозілі. Адзін з вёскі па-нямецку ўмеў і падслухаў у Дуброве, што вёску вывезуць. І ўсе паўцякалі, хто куды. Але майго бацьку, мачаху і сястру вывезлі ў Германію. Асталася я з братам і двое малодшых; пад канец вайны тыя дзве дзяўчыны памерлі. У вёсцы памерла разам чатырнаццаць дзяцей, ад шкарлятыны.

У адной дзяўчыны пакралі дываны і шкуры і нехта сказаў, што злодзей схаваў іх у нашу хату. А я тады пашыла два кажухі і цётка трымала ў нас дываны; ну і ў мяне гэта знайшлі і забралі тое на пастарунак. Але пакрыўджаная дзяўчына сказала, што кажухі тыя і дываны не яе; у яе было такое ж прозвішча, як і ў мяне. Я пайшла іх забраць і паліцаі рыхтаваліся ўжо мяне біць, думаючы, што я ім нахлусіла пра пакражу. Але перакладчык сказаў ім пра памылку.

Калі мінула вайна, зімою вярнуўся бацька; прыехаў санямі. Рускія гаварылі, якімі дарогамі ехаць, бо некаторыя дарогі замінаваныя былі.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Фільмавы вечар

На гэты тыдзень прапаную тры фільмы, якія апошнім часам увайшлі на экраны нашых кінатэатраў. Кожны з іх можна назваць гітам, які заварожвае многіх гледачоў.

„К-19" у рэжысуры Кэтрын Бігелаў, з Гарысонам Фордам, Лаем Нісан і Сэмам Спруэлам у галоўных ролях спадабаецца аматарам гістарычных аповесцей.

Фільм расказвае сапраўдную гісторыю савецкай падлодкі, якая ў 1961 годзе была выслана ў часе „халоднай вайны" на тэрыторыю Атлантычнага акіяна з ракетамі з ядзернымі боегалоўкамі. Мэтай было запалоханне амерыканскай арміі. Аднак маракі не былі тэхнічна падрыхтаваны да задання. Калі паяўляюцца праблемы, улады, у тым ліку і Хрушчоў, не прымаюць за гэта адказнасці. На фоне палітычных гульняў адбываецца драма маракоў, якія вымушаны самі вырашаць сваю будучыню. Вынікі іх рашэнняў не заўсёды аказваюцца станоўчымі. Варта пайсці ў кіно!

„Сэрцаедкі"— амерыканская камедыя ў рэжысуры Дэйвіда Міркіна, пэўна, спадабаецца жанчынам і будзе перасцярогай для мужчын, якія звяртаюць увагу толькі на прыгожы твар і доўгія ногі прадстаўніц жаночага полу.

Можна сказаць, што фільм пачынаецца з канца — з дня шлюбу Анджэлы (у гэтай ролі Сігурні Уівер) і Дзіна (Рэй Ліота), якіх маладымі назваць ужо нельга, але багатымі і закаханымі ў сабе — так. Аднак іх шчасце не трывае доўга. Пасля першай ночы Анджэла застае мужа на любоўным спатканні са сваёй сакратаркай і адразу патрабуе разводу, „мерседэса" і вялікай кампенсацыі, на што Дзін згаджаецца.

Ніхто аднак не ведае, што сакратарка — гэта дачка Анджэлы. Маці з дачкой такім спосабам (першая выходзіць за багатага бізнесмена замуж, а другая кампраметуе жаніха) выцягваюць грошы ад багатых мужыкоў не першы раз. Аднойчы ў справу ўмешваецца ашуканы раней муж, а дачка... ўлюбляецца! Варта даведацца як закончыліся прыгоды Анджэлы і Гелен!

„Эдзі"— найноўшы твор польскай кінематаграфіі спадабаецца ўсім кінааматарам. Рэжысёр Пётр Тшаскальскі прадстаўляе гісторыю чалавека, які нягледзячы на сваю беднасць можа быць нармальным. Герой фільма — алкаголік, які збірае металалом, каб на другі дзень мець за што выпіць. Эдзі (на экране пабачым Генрыка Галамбеўскага) збірае і чытае кніжкі, збірае лом і апякуецца сваім сябрам. Ён нават выконвае ролю бацькі.

Шанаваны як разумны чалавек сярод бамжоў атрымоўвае ён ад ганагстэраў заданне адукаваць іх сястру, якая пазней абвінаваціць яго ў тым, што з'яўляецца бацькам яе ненароджанага дзіцяці. Закаханы Эдзі прымае незаслужаную кару і ахоўвае такім чынам маладую вучаніцу і яе любоўніка. А карай была... кастрацыя. Як закончыцца гісторыя Эдзі пабачыце ў кіно. Варта!

Паўліна Шафран

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Помнік падляшскай мінуўшчыны

Клуня, што на здымку, стаіць у Сасінах Боцькаўскай гміны, на панадворку Рыгора Шатыловіча. Такія збудаванні мала дзе захаваліся. Пра аб'ект майго зацікаўлення гаспадар сказаў:

— Стадола гэтая налічвае больш за сто гадоў. Мой тата, якому, калі б жыў, было б за сотню, гаварыў, што не помніць, калі яе стаўлялі. Яе, бадай, прывёз мой дзед з Чаромхі. Тата яе перакрываў, і я перакрываў, але цяпер ужо нічога не раблю, бо навошта яна каму?!

Стадола яшчэ бароніцца ад наступу часу. Хлеўчык, што побач, ужо здаецца, прыгнечаны сваім доўгім жыццём. Наша мінуўшчына паволі адыходзіць у вечную памяць.

Аляксандр Вярбіцкі

Адмянілі аўтобус ПКС

Напрыканцы шасцідзесятых гадоў пабудавалі гравійную дарогу з Трасцянкі цераз Бялкі і Агароднікі ў Іванкі. Калі дарога была здадзена ў карыстанне, дырэкцыя ПКС у Беластоку пусціла аўтобус праз вышэйзгаданыя вёскі. Аўтобус гэты дазваляў жыхарам вёсак дабрацца ў Нарву і Беласток. З Нарвы можна было даехаць у Бельск-Падляшскі ці Гайнаўку. І ўсім было вельмі добра. Да гэтай дарогі на аўтобусныя прыпынкі прыходзілі жыхары Ванева, Цісоў, Сакоў, Гознай і Каўпакоў.

Калі прадпрыемства ПКС падзялілася і ўтварылася дырэкцыя ў Бельску-Падляшскім, то раніцай у 6^{40} выязджаў і надалей выязджае бельскі аўтобус ПКС з Нарвы праз Рагазы-Іванкі, Агароднікі і Бялкі ў Беласток. Толькі апошнім часам адмянілі яго ў суботы, нядзелі і ўсе дзяржаўныя святы. Жыхарам гэтых вёсак крыўдна, бо няма на чым дабрацца ў Беласток, апроч вечаровага аўтобуса, які едзе з Гайнаўкі і паварочвае праз вёскі. У Бялкі, напрыклад, ён заязджае ў 18^{50}. Гаварыў я з солтысамі некаторых вёсак, каб яны напісалі ў Дырэкцыю ПКС у Бельску-Падляшскім прашэнне аднавіць гэтую лінію і пусціць аўтобус штодзённа. Але солтысы не спяшаюцца, бо кожны мае легкавушку і сам даедзе куды яму трэба. Найгорш, аднак, тым людзям, якія не маюць сваіх машын. Нічога на гэтую тэму не гаварылі і радныя Нарваўскай гміны, бо яны таксама маюць свае ўласныя машыны. Цяпер — пасля выбараў у самаўрады — адна надзея ў новых радных. Пастарайцеся, даражэнькія, каб і старэчы маглі штодзённа выехаць са сваіх вёсак аформіць неабходныя справы ці ў нядзелю паехаць у царкву памаліцца.

Мікалай Лук'янюк

Наконт дэмакратыі

Розна мы думаем пра суседнюю Беларусь і пераважна крытычна: што, маўляў, там брак дэмакратыі, стабільнасці, свабоды... Справа, аднак, выглядае інакш, напрыклад з выдаваннем каштоўных царкоўных кніжак. У нас, для прыкладу, Варшаўская мітраполія нічога цікавага не выдае і паўтараюцца адны тыя самыя загалоўкі. Каб хаця раз у год выдалі якую царкоўную царскую кніжку; вядома, на рускай мове, бо тады беларускіх не было.

Нядаўна быў я ў Грабаўцы са сваёй сумкай і на стале аднаго дзядзькі ўбачыў новую прыгожую і шыкарна выдадзеную кніжку, з цвёрдым пераплётам і на добрай паперы. Кніга тая, „Закон Божий" на рускай мове, выдадзена ў гэтым годзе Мінскай мітраполіяй. Той дзядзька кнігу купіў ад беларускіх манашак, якія ў свята прадавалі свой тавар каля царквы ў Дубічах-Царкоўных. Заплаціў ён за яе 45 злотаў і вельмі задаволены, што купіў кнігу, пра якую здаўна марыў; „Закон Божий" больш варты ад гэтай цаны. Чаму ў нас не могуць паўтарыць такі друк?

Мікалай Панфілюк

Новае ў гайнаўскіх пчаляроў

17 лістапада г.г. адбыўся справаздачны сход Раённага гуртка Падляшскага саюза пчаляроў у Гайнаўцы. Справаздачу зачытаў старшыня праўлення гуртка Уладзімір Лапінскі. Члены праўлення дапамаглі пчалярам купіць таннейшы цукар ды даходзіць сваіх правоў у выпадку атручвання пчол таксічнымі рэчывамі. У. Лапінскі заявіў, што адмаўляецца выконваць абавязкі старшыні гуртка пчаляроў. Пасля працяжнай дыскусіі абавязкі старшыні даверылі Васілю Міхноўскаму.

1 снежня г.г. будуць святкаваць Дзень пчаляра ў Беластоку. З Гайнаўкі паедзе на свята адзінаццаць пчаляроў. Там ім будуць уручаны ўзнагароды.

Пасля сходу спецыяліст па пчалярству Антон Залеўскі з Дарадчага сельскагаспадарчага асяродка ў Шапятове правёў абучэнне на тэму падрыхтоўкі пасекі да зімавання.

Ён заахвоціў сабраных пчаляроў да вучобы ў зімні і ранневясенні перыяд. Весці яе будуць спецыялісты ў кавярні „Цэхова" ў Беластоку, па вуліцы Варшаўскай 4/6. І так, 11 снежня а гадзіне 17^{00} інж. Аляксандр Сокул пазнаёміць з мадэрнізаваным сайдынгавым вулеем, 15 студзеня 2003 года (гадз. 17^{00}) інж. Юры Руткоўскі выступіць з дакладам „Гігіена ў пасецы" і 26 сакавіка 2003 года (а гадзіне 17^{00}) інж. Андрэй Барна раскажа пра стан аховы здароўя пчол. (яц)

У Чаромхаўскім садку

У Чаромхаўскае прадшколле ходзіць 51 дзіця з тэрыторыі ўсяе гміны. Заняткі праводзяцца ў дзвюх групах: шасцігодкаў і малечаў. Дзеткамі займаюцца чатыры выхавацелькі і дырэктар садка Анна Шатыловіч. Старшакамі займаецца выхавацелька Ева Міхальская, а малечамі — Яўгенія Зінкоў. У групе шасцігодкаў — 27 дзетак, а малечаў — 24.

— У наступным годзе шасцігодкі будуць хадзіць у нулявы клас, — гаворыць дырэктар Шатыловіч, — але ў нас гэтай праблемы няма. Бацькі акуратна паставіліся да навучання дзетак і самі добраахвотна пасылалі іх у прадшколле. З Чаромхі-Вёскі, напрыклад, даязджаюць трое шасцігодкаў, з Баброўкі — двое і адно з Янцэвічаў. Кошты даездаў пакрывае гміна.

Кошт утрымання дзіцяці ў садку за цэлы дзень складае 2,60 зл. і 66 зл. стадлай платы, што ў месячным падрахунку складае суму 124-126 зл. Дзеткі, якія прабываюць на працягу дня толькі пяць гадзін у прадшколлі плацяць усяго 26 зл.

— Дзеткі карыстаюцца чатырма заламі і святліцай, — гаворыць дырэктар Анна Шатыловіч. — Памяшканне, хаця знаходзіцца ў старым будынку, цёплае. У час канікулаў быў праведзены неабходны рамонт.

Некалькі разоў у год запрашаем лялечны тэатр. Былі ў нас акцёры з Беластока і Кракава. Дзеткі аплачваюць за білет на спектакль усяго 2-3 зл. Кошты прыезду акцёраў пакрывае бацькоўскі камітэт. Па волі бацькоў разважаем прапанову навучання англійскай мовы, — гаворыць на развітанне дырэктар. — Ахвоту такую прад'явіла дванаццаць дзетак.

Уладзімір Сідарук

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2003 r. upływa 5 grudnia 2002 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Дзесяць гадоў „стварання магчымасцей і новых перспектыў" прынесла плён

Страха

Чатыры сьцяны — гэта яшчэ ня ўсё. Мацуюцца бэлькі, падымаюцца кроквы, і нарэшце прыходзяць *страхары* са сваімі *страхоўкамі* ды кладуць *страху*. Нават калі *страха* новая, праз яе дыхае неба. *Падстрэшша* — першая прыступка да неба, блізкае і жаданае беларускае надзем'е.

Чаго толькі не захоўвалася на *падстрэшшах* нашых хат — кнігі, старыя газэты, непатрэбныя рэчы. У першай палове стагодзьдзя пад *страху* пераносілі кросны і верацёны, старую вопратку, сапсаваныя гадзіньнікі і прасы. Пасьля другой сусьветнай вайны туды патрапляілі беларускія граматыкі і міжваенныя кнігі, рукапісы і цэлыя архівы.

Падстрэшшы і сталіся нашымі архівамі. Мышы і ластаўкі там былі архівістамі, кот — дырэктарам, а кроплі дажджу — наведнікамі і чытачамі. Потым усё гэта расшуквалася і рэстаўравалася, пераносілася ў музэі і прыватныя калекцыі. Мы паступова забывалі пра паходжаньне нашых скарбаў, забывалі пра *страху* і *падстрэшша*. Але варта памятаць: ад войнаў і пераследаў, ад ідэалягічных кампаніяў і размаітых чыстак у Беларусі ёсьць свой прытулак — на *падстрэшшы*, бліжэй да неба.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Ігар Бабкоў
(паводле „ARCHE", 7/2000)

Чорны гумар

— Спачыньце, калі ласка, — запрапанавала адміністратарка хаўтурнага дома чалавеку, які прыйшоў аформіць пахавальныя справы свайго дзядзькі.

— Хопіць, што мой сваяк спачыў, — буркнуў нячасты, дай Бог, наведвальнік сумнага казённага дома.

Вядома, да жартаў не было і адміністратарцы, бо не зразумела, так сказаць, жарту. Мая Агата дык увогуле не разумее чорнага гумару, дык нават не прапаную. Дарэчы, мой гумар мая каханая „дасціпная іначай" жонка называе гумарам пярэстым.

Раз мы нават з адным панурым (меланхалічным іначай) паэтам (пачынаў ён ад прозы, падпісваючыся адмысловымі псеўданімымі, а цяпер ён адно толькі паэт) рашылі спісаць найлепшыя дасціпныя кавалкі. Давай спісваць, у яго дома, у кватэры над адной з цэнтральных вуліц ваяводскага горада. Успамінаем, смяемся — ведаеце, ён гэтак басавіта рагоча, аж мурашкі па спіне бегаюць. Я б прапанаваў яму ролю ў нейкай жахалцы; калі б не ён сам іграў яе, дык дастаткова было б запісу яго голасу. За такое штосьці Оскара можна было б атрымаць, ну, за спецыяльныя эфекты. Я гэтак і сказаў. А тут пад акном узвыў сабака. З чацвёртага паверха пачуў, мабыць, якраз гэты рогат.

Схапіў мой сябра тоўстае тамішча, што ззаду на паліцы пылілася, і махнуў за расчыненае акно. Забака змоўк.

— Ты чым кінуў?

— Беларускай літаратурай. Чуеш, сціх.

— Можа, чытае? А, можа, і пераканаўча ты кінуў.

— Думаеш, можна забіць беларускай літаратурай? — задумаўся беларускі паэт, аўтар, пакуль што, нятоўстых зборнікаў.

— Ну, яшчэ крышку, і цябе запішуць у жывых класікаў, і ты зможаш! — суцешыў я яго, і атрымаў па патыліцы кнігай з бібліятэчкі „Белавежы". Добра, што ў мяккай вокладцы яна была.

Мой сябра-паэт, філолаг, хоча, каб яго маладыя сябры пісалі вершы. Значыць, каб умелі пісаць. Хоць, як кожны з нас заўважыў, паэтам нараджаецца, але, усё ж, нават нарадзіўшыся, бываецца ім рэдка. Калі праз сілу пішаш нейкую там літаратуру, дык што за яна, тая літаратура! Але ж запрапаваў наш паэт працягнуць радкі: „Мой смутак нібы птушка Фенікс". Маладыя паэты (філалогія забівае паэзію, як сказала адна з пачаткоўцаў) працягвалі, бо ж мусова было.

— Дык гэта, вось, той самы чорны гумар, прапанаваць напісаць верш! — уцешыўся я, падумаўшы, што мой чорнагумарны сшытачак папоўніцца наступнымі радкамі. Мой сумны паэт узняў свае тужлівыя цялячыя вялікія вочы:

— Вандал, золатца. Тут табе не жарты. На ацэнку трэба верш напісаць. Каб залік дастаць. Ёсць у нас паэты-прафесары, якія маюць права такое патрабаваць ад філолагаў, асабліва ад філалагінь.

— Ну, дык можа і я верш складу! — уздыхнуў я. І напісаў:

Мой смутак нібы птушка Фенікс,
Ды іншым птушкам — усё да фені.

— Гэта не паэзія! — махнуў сваёй бледнай даланню паэт і небяспечна сягнуў назад да паліцы.

Свой уласны смутак спапяляю,
У горы я сваім згараю!..

— схаманўўся я і рыфмануўся ўжо больш па-паэтычнаму.

Вандал Арлянскі

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

— Пан доктар! Не мінуў месяц ад шлюбу, а я аглух на правае вуха...

— На правае? — дзівуецца лекар. — Дык ваша жонка ляўша?!

* * *

Жонка пануквае мужа, каб той аформіў ёй паховіны з аркестрам, але ён і вухам не вядзе, бо яна яшчэ нестарая і цалкам здаровая.

— Ну і што: зладзіў аркестр?

— Так: маеш быць гатова заўтра а першай гадзіне!

* * *

Вечар напярэдадні юбілею дваццацігоддзя сужонства: абое задумаліся.

— Цікава, што мой каханы муж купіць мне з нагоды гэтага выдатнага юбілею? — радуецца яна.

— Каб яе, халеру, быў тады затоўк, так як думаў, то акурат заўтра выйшаў бы з турмы, — зелянее ад злосці ён.

* * *

У час сямейнай сваркі муж сцвярджае:

— Так папраўдзе, толькі ў магіле буду мець спакой.

— Памыляешся, — перабівае яму жонка, — не забывай, што маем сямейную грабніцу!

* * *

Цяжка хворая жонка мужу:

— Абяцай мне, што пасля маёй смерці твая другая жонка не будзе апранаць маёй адзежы...

— Ну што ты! Не турбуйся: яна высокая і стройная.

* * *

Малады муж з'яўляецца ў радзільны дом, куды пару дзён раней завёз сваю жонку. Акушэрка выносіць яму трайнят. Ён прыглядаецца ім уважліва ды гаворыць:

— Калі не будзеце супраць, дык я выбяру таго пасярэдзіне...

* * *

Кіно, канец фільма. Заззяла святло.

— То ты так пільнуеш дзяцей, — закрычала жанчына да мужчыны праз некалькі радкоў ад яе, — якіх я пакінула табе, выходзячы наведаць маю старэнькую хворую мамачку?!

* * *

— Дарагая суседка! Ці гэта праўда, што ваш муж знаходзіцца ў псіхушцы?

— Праўда. Толькі ён не ў якасці хворага; ён з'яўляецца дэтэктывам. Бачыце, у бальніцы пецярых Банапартаў і ён мае ўстанавіць, каторы з іх сапраўдны.

* * *

Экзамен у марской школе. Спрактыкаваны капітан пытае кадэта:

— Што б вы зрабілі, калі б бура разгулялася з правага боку карабля?

— Кінуў бы якар.

— А што б вы зрабілі, калі б бура навалілася з другога боку?

— Кінуў бы другі якар.

— А калі б бура накінулася на карабель спераду?

— Кінуў бы чарговы якар...

— Будзьце ветлівы сказаць, адкуль вы бярэце ўсе гэтыя якары?

— А адкуль вы бярэце ўсе гэтыя буры?

* * *

— Афіцыянт! Гэтае кураня непрыгоднае для яды.

— Немагчыма! Дзесяць гадоў яно брала першыя прызы на ўсіх выстаўках.

* * *

— Афіцыянт! Гэта скандал: у маім супе плавае слыхавы апарат...

Афіцыянт пахіляецца над спажыўцом:

— Выбачайце: што вы сказалі?

Крыжаванка



Гарызантальна: 4. кніжка для першапачатковага навучання грамаце, 7. аддаленая імгненная ўспышка на небе, 8. алей з насення клешчавіны, 9. дачка Рагвалода, 10. горад, возера і нацыянальны парк у заходняй частцы Кеніі, 14. амерыканскі прэзідэнт між Джонсанам і Фордам, 18. трапічная груша (*Persea americana*), 19. начны адпачынак, 20. паўднёваамерыканская травяністая расліна (*Arracacia xanthorhiza*), 21. прозвішча аўтара „Гяура".

Вертыкальна: 1. верхні слой глебы густа пераплецены карэннем раслін, 2. не комік, 3. неажыццявімая дзіўная мара, 4. самец авечкі, 5. малы кот, 6. Хасэ Марыя, іспанскі прэм'ер-міністр, 11. ноша, якую можна абхапіць рукамі, 12. магутны вецер, 13. Аляксандр, сенатар, публіцыст, адзін з заснавальнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады (1874-1941), 15. Адысеева выспа, 16. трэці перыяд палеазойскай эры, 17. рэвальвер з рухомым барабанам.

(Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 41 нумара

Гарызантальна: Сеара, авансцэна, вецер, альфа, Вац, пагроза, Абхазія, Тар, Артэк, Арыка, Аргенціна, Ленін.

Вертыкальна: лансада, стаер, Адэса, акцёрства, Алькарыса, Врача, афіша, ват, цар, апанент, кагал, акіян.

Рашэнне: **Хто весяліцца, не знае радасці**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

ISSN 0546-1960